Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца з 9-й да 3½ гадз. Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. • 3 • — 2 р. 70 к. • 6 • — 4 р. — к. • 1 год — 8 р. — к. Змена адрасу: іншагародзяе — 20 к. місцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок пайпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок пайпарэлі пасьлядо тэксту 1 р. — к. За радок пайпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпешныя на 50 проц. дарэйшай. Зьніж тарыфу бярацца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 к. Бескаштоўн. і чырвонаармейцы за дакумант — 15 к. За кожны дадатковы — 5 к. Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газеты, на ўсіх аддаленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газеты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 127 (2315) Нядзеля, 3-га чэрвеня 1928 г.

НА ХЛЕБНЫМ ФРОНЦЕ.

Гутарка тав. Сталіна з студэнтамі Інстытуту Чырвонае Прафэсуры, Камун. Акадэміі і Сьвярдлоўскага унівэрсытэту.

Аснова нашых хлебных цяжкасьцяў у адставаньні росту вытворчасьці хлеба ад росту яго спажываньня.

НЯ МОЖА БЫЦЬ ніякага павароту ў бок разьвіцьця індывідуальнае кулацкае гаспадаркі.

Аснова нашага с.-г. росту толькі ў калектывізацыі індывідуальных сялянскіх гаспадарак.

ЗРАБІЦЬ УСЁ МАГЧЫМАЕ, КАБ УЗЬНЯЦЬ ТАВАРНАСЬЦЬ САВЕЦКІХ, КАЛЕКТЫЎНЫХ І БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ГАСПАДАРАК.

Што належыць лічыць асноўным у нашых цяжкасьцях у хлебнай справе? У чым выхад з гэтых цяжкасьцяў? Якія павінны быць вывады ў зьвязку з гэтымі цяжкасьцямі ў адносінах тэмпу разьвіцьця нашае індустрыі наогул, асабліва з пункту гледжаньня суадносін між лёгкаю і цяжкаю індустрыяю?

Прычыны цяжкасьцяў на хлебным фронце.

На першы погляд можа здавацца, што нашыя хлебныя цяжкасьці, гэта выпадковае зьявішча, выкліканае толькі ў выніку неадпаведнага плянаваньня, толькі ў выніку памылак у справе гаспадарчага збалянсаваньня. На справе-ж прычыны цяжкасьцяў ляжаць тут значна глыбей. Аснова нашых хлебных цяжкасьцяў у тым, што рост вытворчасьці таварнага хлеба ідзе ў нас марудней, чымся рост спажываньня яго. Сёлета ў нас мелася ў руках дзяржавы значна больш хлеба, як у мінулыя гады. Мы мелі сёлета на 1 красавіка загатоўленага хлеба для патрэб краю на 100 млн. пуд. больш, чымся ў мінулым годзе і на 230 млн. пуд. больш, чымся ў пазалеташнім годзе. І ўсё такі мы маем сёлета цяжкасьці на хлебным фронце.

Хіба-ж гэта ня факт, што мы ўжо дасягнулі даваенных норм засеўных абшараў? Факт. Хіба-ж гэта ня факт, што валавая прадукцыя хлеба ўжо летась дасягнула даваеннае нормы вытворчасьці, г. зн. даходзіла да 5 міліярдаў пуд хлеба? Факт. Чым-жа тлумачыцца ў такім разе, што, не зважаючы на гэта, мы маем таварнага хлеба ў два разы менш, а вывозім заграніцу хлеба разоў у 20 менш, чымся ў даваенны час? Тлумачыцца перш за ўсё, і галоўным чынам, зьменаю стану нашае сельскае гаспадаркі ў выніку Кастрычнікавае рэвалюцыі, пасьля пераходу ад буйнае абшарніцкае і буйнае кулацкае гаспадаркі, якая давала найбольшую колькасьць таварнага хлеба, да дробнае і сярэдняе сялянскае гаспадаркі, якія дае найменшую колькасьць таварнага хлеба. Узяць, напрыклад, калектыўныя і савецкія гаспадаркі. Яны даюць у нас таварнага хлеба 17,2 проц. усяе свае валавае вытворчасьці. Інакш кажучы, яны даюць таварнага хлеба больш, чымся абшарніцкія гаспадаркі ў даваенны час. А дробныя і сярэдняя сялянскія гаспадаркі? Яны даюць у нас таварнага хлеба ўсяго толькі 11,2 пр. усяе сумы сваёй прадукцыі. Розьніца, як бачыце, досыць красамоўная. Ліквідацыя абшарніцкае (буйнае) гаспадаркі, скарачэньне кулацкае (буйнае) гаспадаркі больш як у тры разы і пераход да дробнае сялянскае гаспадаркі, якая дае толькі 11 проц. таварнасьці, пры адсутнасьці толькі-небудзь разгорнутае буйнае грамадзкае гаспадаркі ў галіне хлебнае вытворчасьці (калектыўныя і савецкія гаспадаркі), павінны былі прывесьці і сапраўды прывялі да вострага скарачэньня вытворчасьці таварнага хлеба, у параўнаньні з даваеннымі часам. Гэта факт, што мы маем зараз у два разы менш таварнага хлеба, не зважаючы на даваенную норму валавае прадукцыі хлеба.

Вось дзе аснова нашых цяжкасьцяў на хлебным фронце.

Дзе выхад з становішча.

Ёсьць людзі, якія бачаць выхад з гэтага становішча ў звароце да кулацкае гаспадаркі, у разьвіцьці і разгортваньні кулацкае гаспадаркі. Гэтыя людзі не адважваюцца гаварыць аб звароце да абшарніцкае гаспадаркі, відаць разумеючы, што небясьпечна гаварыць аб гэткіх рэчах у наш час. Але яны тым больш ахвотна гавораць аб неабходнасьці ўсямернага разьвіцьця кулацкае гаспадаркі ў інтарэсах савецкае ўлады. Гэтыя людзі думаюць, што савецкая ўлада магла-б абапірацца на дзьве процілеглыя клясы: на клясу кулакоў, гаспадарчым прынцыпам якіх зьяўляецца эксплёатацыя рабочае клясы, і на клясу рабочых, гаспадарчым прынцыпам якіх зьяўляецца зьнішчэньне ўсякае эксплёатацыі. Фокус варты рэакцыянэраў. Ня варта і даводзіць, што гэтыя рэакцыйныя «пляны» ня маюць нічога супольнага з інтарэсамі рабочае клясы, з прынцыпамі марксызму, з задачамі ленінізму. Гутаркі пра тое, што кулак «ня горш» за гарадзкога капіталіста, што кулак улуляе ня большую небясьпеку, чымся гарадзкі нэпман, што таму нам няма чаго «баяцца» зараз кулацтва,—гэткія гутаркі зьяўляюцца пустою лібэральнаю балбатнёю, якая ўсыпляе настарожанасьць рабочае клясы і асноўных мас сялянства. Ня трэба забываць, што калі ў індустрыі мы можам супроцьставіць дробнаму капіталісту ў горадзе буйную сацыялістычную прамысловасьць, якая складае дзесятых масы прамысловых тавараў, дык буйнай кулацкай вытворчасьці ў вёсцы мы можам супроцьставіць па лініі вытворчасьці толькі слабыя яшчэ калектыўныя і савецкія гаспадаркі, якія вытвараюць у 8 разоў менш хлеба, чымся кулацкія гаспадаркі. Не разумеюць значэньня буйнае кулацкае гаспадаркі ў вёсцы, не разумець таго, што ўдзельная вага кулацтва ў вёсцы ў сто разоў вышэй, чымся ўдзельная вага капіталістаў у гарадзкой прамысловасьці—гэта значыць страціць глузд, парваць з ленінізмам, перабегчы на бок ворага рабочае клясы.

ВЫХАД—у пераходзе ад індывідуальнае сялянскае гаспадаркі да калектыўнае, да грамадзкае гаспадаркі ў земляробстве.

Да арганізацыі калектыўных гаспадарак Ленін заклікаў партыю яшчэ з першых дзён Кастрычнікавае рэвалюцыі. Аднак, на заклік да калектыўных гаспадарак масы адгукнуліся толькі ў апошні час. Тлумачыцца гэта перш за ўсё тым, што шырокае разьвіцьцё каапэрацыйнае грамадзкасьці ў вёсцы падрыхтавала пералом у настроі сялянства ў карысьць калектыўных гаспадарак. 15 зьезд партыі меў падставу, калі прызнаў, што ўмовы для масавага калектыўна-гаспадарчага руху ўжо пасьпелі, што ўзмацненьне калектыўна-гаспадарчага руху зьяўляецца адным з найбольш сур'ёзных сродкаў для ўзьняцьця таварнасьці хлебнае вытворчасьці ў краі.

Павінны ўзьняць таварнасьць сельскае гаспадаркі.

Валавая прадукцыя хлеба ў калектыўных гаспадарках у 1927 г. складала, водлуг даных ЦСУ, ня менш 55 мін. пуд. з агульнаю сярэдняю таварнасьцю ў 30 проц. Задача ў тым, каб: 1) захаваць існуючы тэмп разьвіцьця калектыўна-гаспадарчага руху, узбуйніць калектыўныя гаспадаркі, адкінуць фальшывыя калектыўныя гаспадаркі, замяніўшы іх сапраўднымі калектыўнымі гаспадаркамі, і вызначыць такі рэжым, каб калектыўныя гаспадаркі давалі дзяржаўным і каапэрацыйным арганізацыям увесь свой таварны хлеб пад пагрозаю пазбаўленьня субсыдый і крэдытаў з боку дзяржавы. Я думаю, што, пры выкананьні гэтых умоў мы маглі-б дамагчыся таго, каб гады праз 3—4 мець ад калектыўных гаспадарак мільёнаў 40—50 пудоў таварнага хлеба.

2) Выхад у тым, каб пашырыць і ўзмацніць старыя савецкія гаспадаркі, арганізаваць і разгарнуць новыя буйныя савецкія гаспадаркі. Ужо распачата арганізацыя гэтых савецкіх гаспадарак. Зараз перад намі стаіць задача правесьці ў жыцьцё гэтую пастанову савецкае ўлады чаго-б гэта ні каштавала. Я думаю, што пры ўмове выкананьня гэтых задач мы маглі-б дамагчыся таго, каб мець ад старых і новых савецкіх гаспадарак гады праз 3—4 мільёнаў 80—100 пудоў таварнага хлеба.

3) Выхад, нарэшце, яшчэ ў тым, каб сыстэматычна ўзьнімаць ураджайнасьць дробных і сярэдніх індывідуальных сялянскіх гаспадарак. Мы ня можам і не павінны падтрымліваць індывідуальную буйную кулацкую гаспадарку. Але мы можам і павінны падтрымліваць індывідуальную дробную сярэднюю гаспадарку, уздымаючы яе ўраджайнасьць і ўцягваючы яе ў логва каапэрацыйнае арганізаванасьці. Усе даныя гавораць, што ўраджайнасьць сялянскае гаспадаркі можна было-б узьняць у працягу некалькіх гадоў процантаў на 15—20. Зараз ужываецца ў нас ня менш 5 мільёнаў сох; адна толькі замена сахі плугам магла-б даць сур'ёзны прырост ураджаю хлеба ў краі. Я думаю, што пры сур'ёзнай працы ў гэтым напрамку мы маглі-б мець праз 3—4 гады ня менш 100 мін. пуд. новага таварнага хлеба ад дробных і сярэдніх індывідуальных сялянскіх гаспадарак.

Такім чынам, пры ўмове выкананьня ўсіх гэтых задач, мы маглі-б мець праз 3—4 гады ў дзяржаве НОВЫХ 200—250 МІЛЬЁНАЎ ПУДОЎ ТАВАРНАГА ХЛЕБА—больш ці менш даволі для таго, каб такім чынам манэўраваць як унутры краю, так і па-за-межамі яго.

Не зьмяняць тэмпу індустрыялізацыі.

Вось асноўныя мерапрыёмствы, неабходныя для таго, каб перамагчы гэтыя цяжкасьці на хлебным фронце. Злучыць гэтыя асноўныя з бягучымі мерапрыёмствамі па палепшаньні плянаваньня ў галіне дастаўкі вёсцы тавараў, вызваліўшы нашыя гандлёвыя арганізацыі ад абавязкаў дастаўкі хлеба ў цэлы шэраг дробных і сярэдніх гарадоў—вось цяпер наша асноўная задача.

Ці ня варта побач з гэтымі мерапрыёмствамі ўжыць яшчэ шмат захадаў, скажам, мерапрыёмстваў для больш павольнага тэмпу разьвіцьця нашае індустрыі, рост якое стварае ўзмоцнены попыт на хлеб, які абганяе пакуль-што рост вырабу таварнага хлеба? Не, ня варта. Ні ў якім выпадку. Прыпыніць тэмп разьвіцьця індустрыі, значыць паслабіць рабочую клясу, бо кожны крок наперад у справе разьвіцьця індустрыі, кожная фабрыка, кожны новы завод зьяўляюцца, водлуг слоў Леніна, «новаю крэпасьцю рабочае клясы», якая ўзмацняе яе пазіцыі ў барацьбе з дробна-буржуазнай стыхіяй, у барацьбе з капіталістычнымі элемэнтамі нашае гаспадаркі.

Можа трэба было-б для большае «асьцярогі» затрымаць разьвіцьцё цяжкае прамысловасьці з тым, каб зрабіць лёгкую прамысловасьць, працуючую, галоўным чынам, на сялянскі рынак, базаю нашае індустрыі? Ні ў якім выпадку. Гэта было-б самагубствам, падрывам усяе прамысловасьці, у тым ліку і лёгкае прамысловасьці. Гэта азначала-б адыход ад лёзунгу індустрыялізацыі нашага краю, ператварэньне нашага краю ў дадатак капіталістычнае сыстэмы гаспадаркі.

Шлях да ўзмацненьня саюзу пралетарыяту і сялянства.

Як будзе стаяць справа з саюзам рабочых і сялян у зьвязку з намечанымі мерапрыёмствамі? Я думаю, што гэтыя мерапрыёмствы могуць толькі зрабіць больш лёгкаю справу ўмацаваньня саюзу рабочых і сялян. І сапраўды, калі калектыўныя савецкія гаспадаркі будуць разьвівацца паскораным тэмпам, калі ў выніку простае дапамогі дробным і сярэдзім гаспадаркам ураджайнасьць іх гаспадарак будзе ўзьнімацца, а каапэрацыя будзе ахапляць усё больш шырокія масы сялянства; калі дзяржава атрымае новыя сотні мільёнаў пудоў таварнага хлеба, неабходнага для манэўраваньня; калі ў выніку гэтых і падобных ім мерапрыёмстваў кулацтва будзе зацыпоньвацца і паступова перамагацца, дык ці-ж ня выходзіць, што СУПЯРЭЧНАСЬЦІ між рабочай клясай і сялянствам унутры саюзу рабочых і сялян будуць пры гэтым УСЁ БОЛЬШ І БОЛЬШ ЗГЛАДЖВАЦЦА, патрэба ў надзвычайных мерах па загатоўцы хлеба будзе адпадаць, шырокія масы сялянства [illegible] ракцтар; ці-ж ня праўда, што справа саюзу рабочых і сялян можа толькі выйграць ад такіх мерапрыёмстваў? Усякае іншае разуменьне саюзу рабочых і сялян ёсьць апартунізм, меншавізм, эсэрства, усё што хочаце, толькі не марксызм, толькі не ленінізм. Саюз пралетарыяту з сялянствам ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту НЯ ЁСЬЦЬ САЮЗ З УСІМ СЯЛЯНСТВАМ. Саюз пралетарыяту з сялянствам зьяўляецца саюзам рабочае клясы з працоўнымі масамі сялянства. Такі саюз ня можа быць ажыцьцёўлен без барацьбы з капіталістычнымі элемэнтамі сялянства, без барацьбы з кулацтвам. Такі саюз ня можа быць трывалым без арганізацыі бедноты, як апоры рабочае клясы на вёсцы. Таму саюз рабочых і сялян у сучасных умовах дыктатуры пралетарыяту можа быць ажыцьцёўлены толькі пад вядомым лёзунгам Леніна: «АБАПРЫСЯ НА БЕДНАТУ, НАЛАДЖВАЙ ТРЫВАЛЫ САЮЗ З СЕРАДНЯКОМ, НІ НА ХВІЛІНУ НЯ СПЫНЯЙ БАРАЦЬБЫ З КУЛАЦТВАМ». Бо толькі пе-

АБ СТАНОВІШЧЫ МАСАВАЙ ПРАЦЫ НІЗАВЫХ САВЕТАЎ.

Праведзеныя кампаніі на вёсцы: па самаабкладаньні, па загатоўках хлеба і сыравіны, па распаўсюджваньні сялянскае пазыкі, пасяўная кампанія і г. д.—зьявіліся генэральнай праверкай становішча нашага нізавога савецкага апарату на вёсцы. Як у люстры адбіліся ўсе недахваты, памылкі і слабасьці працы саветаў, ня гледзячы на агульны рост працаздольнасьці савецкага актыву і палепшаньне працы саветаў наогул. Спэцыяльная інструктарская праверка каля сотні сельскіх і местачковых саветаў і шэрагу райвыканкомаў яскрава сьведчыць аб якасьці масавай працы саветаў і выканкомаў,—гэтай галоўнай задачы ў нашым будаўніцтве.

Даючы агульную ацэнку становішча нізавых саветаў, мы павінны сказаць, што ў параўнаньні з мінулымі гадамі мы маем значныя дасягненьні, як у сэнсе разгортваньня масавай працы, гэтак і ў палепшаньні практычнай дзейнасьці ўсяго нашага нізавога савецкага апарату. Сельскія і местачковыя саветы ў большасьці сваёй сталі сапраўднай і асноўнай формай аб'яднаньня бядняцка-серадняцкіх мас сялянства навокал вырашэньня галоўнейшых культурна-гаспадарчых пытаньняў жыцьця вёскі. З пашырэньнем правоў нізавых савецкіх органаў, апошнія значна наблізіліся да насельніцтва, палепшылася іх абслугоўваньне. Значна разгарнулася масавая работа саветаў у сэнсе больш рэгулярнага скліканьня пленумаў саветаў, выканкомаў; павялічылася актыўнасьць удзельнікаў на пленумах, значна павялічыўся ўдзел бядняцка-серадняцкага актыву ў рабоце пленумаў, павялічыўся ўдзел жаночага актыву.

Інтарэсы беднаты, за некаторым выключэньнем, правільна знаходзяць свой адбітак у пастановах сельскіх, местачковых саветаў і райвыканкомаў. Узросшая сетка нацыянальных саветаў забясьпечвае абслугоўваньне гаспадарча-культурных запатрабаваньняў нацыянальных меншасьцяў. З партыйцаў, камсамольцаў, батракоў, сялянскай беднаты і жанчын-актывістак выкаваліся за гады ад Кастрычнікавае рэвалюцыі шэрагі лепшых савецкіх працаўнікоў, якія, зразумела, праводзяць дырэктывы партыі і мерапрыёмствы савецкае ўлады ў штодзённай масавай і практычнай сваёй працы. Усё гэта ёсьць бясспрэчныя факты агульнага становішча саветаў на сёньнешні дзень.

Разам з дасягненьнямі мы павінны мець на ўвазе шэраг дробных і буйных недахватаў у масавай працы саветаў, якія нам и абходна зьнішчыць.

Мы ведаем, што ў гэтым годзе ў цэлым шэрагу саветаў, на жаль, былі правалены сельска гаспадарчыя мерапрыёмствы савецкай улады (самаабкладаньне, пазыка) толькі з прычыны слабасьці, а часамі адсутнічаньня масавай працы саветаў сярод сялянства. І наадварот, у тых мясцох, дзе саветамі ўцягнуты ў савецка-грамадзкую працу шырокія гушчы сялянства, там усе загады Савецкага ўраду на карысьць самога сялянства праводзіліся пасьпяхова.

На жаль, мы маем яшчэ такія саветы, дзе пленумаў ня было ад таго часу, калі выбіраліся прэзыдыум, старшыня і сакратар савету. Гэта азначае, што ў такіх саветах ня было пленумаў каля паўтара году. Напрыклад, Чачэвіцкі с.-савет, які зьбіраецца раз у 52 тыдні і Дубенскі с.-с., які склікае прэзыдыум адзін раз у 6 месяцаў, а пленум—праз год. Па некалькіх саветах прэзыдыумы склікаюцца праз 13 тыдняў, а пленумы—праз 3-4 м-цы. [illegible] падрыхтоўкі пытаньняў, вырашэньня іх, пляновага разгляду і выкананьня пастаноў і загадаў, знаходзім у вялікай колькасьці саветаў нездавальняючае становішча. Частка рэвізійных камісій пры саветах амаль-што не вядзе належнай працы, не знаёміць насельніцтва вёскі з матар'яльна-грашовым становішчам і работай саветаў. У масавай працы саветаў трэба лічыць недахват канкрэтнага кіраўніцтва, жывога, а не пісьмовага інструктаваньня.

Таму, ня гледзячы на становучыя дасягненьні ў масавай працы саветаў мы ня можам супакоіцца і сказаць, што ўсё і ўсюды добра. Сучаснае становішча саветаў, пры яшчэ недастатковасьці разгортваньня ўсімі саветамі масавай працы, ня можа забясьпечыць поўнае і пасьпяховае вырашэньне ўсіх задач, якія пастаўлены партыяй перад саветамі ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва. Неабходны рашучыя меры па ўзмацненьні дзейнасьці саветаў, па ўцягненьні сялянскага актыву ў савецкую і грамадзкую працу.

Усё ўзрастаючая актыўнасьць рабочых і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі патрабуе ад саветаў чуткасьці, дзелавітасьці, лепшых форм і метадаў скарыстаньня гэтай актыўнасьці для сацыялістычнага будаўніцтва. У практычным вырашэньні пытаньняў па калектывізацыі сельскае гаспадаркі, каапэраваньні насельніцтва, культурнага будаўніцтва, барацьбы з бюракратызмам і значыннасьцю,—саветы і выканкомы павінны быць непасрэдна зьвязаны з актывам і шырокімі коламі ўсяго насельніцтва. Бяз шырокага ўдзелу працоўных мас мы ня зможам пасьпяхова вырашыць пастаўленых задач, як ужо няраз мы бачылі пры правядзеньні розных палітычных і гаспадарча-культурных кампаній сярод насельніцтва. Таму, усялякія спробы паасобоных кіраўнікоў-бюракратаў, якія імнуцца замяніць калектыўна-масавую працу сваім асабістым адміністраваньнем, павінны самім савецкім актывам ліквідавацца без спазьненьня. Тыя старшыні сельскіх і местачковых саветаў, якія па паўгода, на году ня склікаюць пленумаў саветаў, ня кіруюць працай камісій, не вядуць масавай савецкай працы,—павінны несьці адказнасьць перад выбаршчыкамі і вышэйстаячымі органамі, як за самае вялікае злачынства ў парушэньні савецкіх законаў, савецкай дэмакратыі. Працоўныя масы і выканкомы не павінны дапускаць замест саветаў—масавай арганізацыі дыктатуры пралетарыяту — існаваньня старшынь сельсаветаў бяз працы саветаў. Нам патрэбна праца ўсяго савету, а не аднаго старшыні ў форме быўш. старасты, ці сопкага. Апарат савету, яго прэзыдыум ёсьць толькі выканаўчы орган усяго савету выбаршчыкаў, праз які шырокія масы актыву кіруюць справамі. Таму якасьць работы саветаў вызначаецца тым, наколькі добра пастаўлена ў іх масавая праца, перш за ўсё. Утвораныя камісіі пры сельсаветах павінны мець працу як па сваёй уласнай ініцыятыве, гэтак і па даручэньні саветаў. Пленумы саветаў павінны абавязаць прэзыдыумы, каб усе важнейшыя пытаньні будаўніцтва вёскі разглядаліся саветамі пасьля прапрацоўкі іх у камісіях. Трэба дабіцца нармальнага становішча, каб прапановы камісій і паасобных членаў іх абгаварваліся прэзыдыумамі сельсаветаў самым уважлівым чынам.

Кіраўнікі саветаў і выканкомаў — прэзыдыумы, павінны забясьпечыць поўнае ажыцьцяўленьне лёзунга партыі аб крытыцы і самакрытыцы ў рабоце на пленумах, прэзыдыумах і сельскіх сходах. Выпадкі запрэсій і застрачэньні не павінны мець месца [illegible]

Што гавораць абвінавачаныя па працэсу „126“ у Беластоку.

(Ад спэцыяльнага карэспандэнта).

Пасьля таго, як была скончана чытка абвінавачэньня акту, суд распачаў допыт абвінавачаных—ці прызнаюцца членам МОПР'у, куды, па яго словах, уваходзяць мілёны людзей і якая мае сваёй мэтай змагацца проці [illegible] ты, але не ўваходзіла ў акруговы камітэт. Яна толькі кіравала працай у Беластоку.

Працэс шахцінскіх контр-рэвалюцыянэраў.

СУД РАЗБЛЫТВАЕ ВУЗЕЛ СУВЯЗЯЎ КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЙНАЕ АРГАНІЗАЦЫІ З НЯМЕЦКІМІ ФІРМАМІ.

Эліадзэ не ўдалося абвінаваціць усяго інжынэрства.

МАСКВА, 1-6. На ранішнім пасяджэньні 1-га чэрвеня суд агалашае ўласнаручна напісаную Эліадзэ заяву, пададзеную ўпаўнаважанаму АДПУ Паўночна-Каўказскага краю ў часе следзтва па шахцінскай справе, якую сам пахсудны назваў „шчырай споведзьдзю». Гэтая заява ўжо вядома з акту абвінавачаньня. У ёй Эліадзэ прызнаецца, што большасьць асоб інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу «адным мірам мазаны».

У сваіх тлумачэньнях наконт гэтае заявы, якую Эліадзэ паньвердзіў у часе сваіх паказаньняў у судовага следчага Ляментара, Эліадзэ зусім заблытваецца.

Грамадзкага абвініцеля т. Шэйна цікавіць наступнае пытаньне. Абвінавачаны Эліадзэ заяўляе перад судом, што прыехаўшы ў Маскву ў 1923 годзе на курсы павышэньня кваліфікацыі інжынэраў, на якіх былі інжынэры з усяго Саюзу, ён, Эліадзэ пад уплывам інжынэрскага асяродку зьмяніў свой сьветапагляд, з ім здарыўся пералом.

Тав. Шэйн пытае «Што-ж інжынэрства, якое прыехала на гэтыя курсы, было таго-ж рангу, таго-ж тыпу з тымі, хто трымаў камень за пазухай, якія былі ў Данбасе, згодна характарыстыкі, дадзенае абвінавачаным?

— Я думаю—адказвае Эліадзэ.

— Значыць, маскоўскае інжынэрства мела такі-ж настрой, што і інжынэрства ў шахцінскім раёне ў 1923 г.?

— Гэта была мая думка—адказвае Эліадзэ. На далейшыя запытаньні Эліадзэ дае зусім неўразумелыя тлумачэньні.

Як Башкін прадаваўся заграніцы.

Судовая прысутнасьць пачынае допыт другога абвінавачанага інжынэра Башкіна. У акце абвінавачаньня Башкін займае даволі значнае месца. Ён належыць да таго групы шкодзікаў, якая была завербавана Балгановым, разам з Каладубамі, Самойлавым, Бабенка і інш. Башкін—у апошні час быў галоўным мэханікам Уласаўскага кіраўніцтва капальняў. У сваіх шкодніцкіх учынках ён прызнаўся. Але Башкін быў ня толькі шкоднікам. Ён быў адным з тых членаў шкодніцкае арганізацыі, якія наладжвалі сувязь з заграніцаю, ён клапаніўся «аб узмацненьні сродкаў арганізацыі». У Берліне ў «прускім аддзеле» фірмы А. Э. Г. служыў брат Башкіна Ісай эмігрант, уцёкшы за граніцу ў пэрыядзе 22 г. Ад гэтага Башкіна в АЭГ ніці сувязі ішлі ў Данбас да яго брата Абрама і праз яго зьвязваліся з працаваўшымі тут шкодніцамі.

Башкін вельмі падрабязна спыняецца на сваёй „працы" на капальнях.

У 1925 г. Башкін атрымаў першы ліст ад брата, які прывёз яму інжынэр Генцлер, інспэктар фірмы АЭГ па праверцы закажаў. У гэтым лісьце Башкін паведамляў брату, каб ён ня дзівіўся тым паведамленьням, якія будуць рабіць яму чужаземцы.

Генцлер сказаў яму наступнае: „Заграніцаю цікавяцца становішчам вашага абсталяваньня, тым, як яно працуе і як відзецца праца і што нядобра і робіцца ня так, як трэба.

Аб тым,што адказаў Башкін на гэтае запытаньне Генцлера, ён не гаворыць. Генцлер прабыў на капальнях пасьля гэтага тры, ці чатыры тыдні, праверыў рысункі па заказах, выконваемых фірмай для Уласаўскае капальні і выехаў.

У далейшым, водгук слоў Башкіна, у яго пачаўся з братам рэгулярная перапіска. У 1927 г. у адным з чарговых лістоў брат паведаміў, што ў Расею едзе адзін манцёр Майер. Сапраўды, хутка Башкін даведаўся, што манцёр Майер прыехаў. Пасьля Майера з Берліна прыехаў таксама і новы інспэктар АЭГ, нейкі Бэгнер. Бэгнер павінен быў праверыць электрычную ўстаноўку і высхаць, але тэхнічны аддзел Донвугалю пакінуў яго на Уласаўцы другім кіраўніком тэхнічнае працы, як чалавека, які мае вялікі вопыт.

Бэгнер таксама меў даручэньне для Башкіна ад яго брата, Брат паведамляў, што заграніцаю ведаюць аб арганізаваным шкодніцтве, якое ўжо даўно праводзіцца Донвугалем, і што такое-ж шкодніцтва было-б пажадана ажыцьцёвіць і на Уласаўцы. Бэгнер пачаў даваць інструкцыі аб шкодніцтве. Ён гаварыў, што было-б пажадана, каб шкодніцтва вялося на машынах дробных. Але шкодніцтва на машынах дробных павінна быць толькі пачаткам. Бэгнер казаў, што заграніцаю лічаць, што шкодніцтва павінна ахапляць паступова і буйныя машыны і весьціся ў больш шырокім абхвале. Наконт гэтага інструкцыі павінен быў даць Майер.

Праз некалькі дзён, калі Майер пазнаёміўся з Башкіным бліжэй, ён сказаў яму, што ведае добра і яго брата. Башкін гаворыць, што гэтая размова дала яму падставу падумаць, што Майер належыць да шкодніцкае арганізацыі. Перад пускам турбіны на Уласаўскай электрастанцыі Майер паведаміў Башкіну, што ён «мае даручэньне азнаёміць каго-небудзь, як трэба абыходзіцца в турбінай, каб яна была пашкоджана». Наколькі можна зразумець Башкіна, тут мела месца ня столькі выпадковае тлумачэньне таго, чым можна пашкодзіць турбіне, колькі праднамеранае зазначэньне на тое, як трэба ёй пашкодзіць. Гутарка ішла ў падвале электрастанцыі ў пасьляпаўднёвы час, калі навакол нікога ня было.

Даведаўшыся ад Башкіна, што ў яго выпадкова ёсьць рысункі „Артемстрою" Майер «між іншым» сказаў: „Як прадстаўнікі фірмы, я і інжынэр Отто зацікавіліся-б гэтым».

„Культурныя" абыходзіны Башкіна з рабочымі.

На вячэрнім пасяджэньні праводзіцца дазнаньне, як адносіўся Башкін да рабочых і да працаваўшых у яго вайскова-паланных. Тав. Крылевка ставіць падсудному пытаньне: „У чым канкрэтна выяўляліся вашы непаразуменьні, якія мелі месца ў вас з рабочымі ў перыяд да Кастрычніцкае рэвалюцыі?

— Выключна ў патрабаваньні працы, павышаньні працы,—адказвае падсудны.

— Якіх-небудзь эксцэсаў у адносінах да рабочых з важага боку ня было?

— Не, ні мая фігура, ні мой рост не маглі дазволіць мне рабіць гэта.

— Ці ня было з вашага боку выпадкаў пагроз, ці даносу?

— Не... між іншым, адзін факт быў, калі я дастаў скрыню аднаго машыніста каля турбіны і штурхнуў яго. Ён быў ростам у сажань і штурхнуў мяне таксама.

— Адзін раз гэта было?

— Але, адзін раз.

У залю ўводзіцца сьведка Чэбатаў-памоцнік сьлесара на турбіне на электрастанцыі, якой загадваў Башкін. Сьведка пацьвярджае даныя аб суровых паводзінах Башкіна з рабочымі і палоннымі і апавядае выпадак грубага мардабою.

Зусім аналёгічныя паказаньні аб суровых паводзінах Башкіна з рабочымі дае і другі сьведка, рабочы Жукаў. Апрача таго, у справе ёсьць паказаньні 13 сьведак, апытаных на папярэднім следзтве, якія паказваюць, што Башкін абыходзіўся з рабочымі вельмі груба і біў іх.

Абвінавачэньне распачынае выяўленьне шкодніцкае дзейнасьці Башкіна.

Ва ўсім прызнаўся.

МАСКВА, 1-VI, 1-га чэрвеня вячэрняе пасяджэньне было прысьвечана далейшаму допыту Башкіна. Башкін пацьвярджае ваўнасьць шкодніцкае працы і на Уласаўцы, куды ён перайшоў з Данецка-Грушаўскага кіраўніцтва капальняў. Башкін падае прозьвішчы ўдзельнікаў шкодніцкае арганізацыі, у тым ліку Беразоўскага, Колганава і Гарлецкага. Ён у сваіх паказаньнях выкладае задачы шкодніцкае арганізацыі, зазначае, што пры выезьдзе заграніцу зьбіраў патрэбныя для арганізацыі весткі, а таксама прызнаецца, што атрымліваў грошы за сваю працу. Башкін адзначае таксама, што ў часе наведваньня ім чужаземнага аддзелу Донвугалю (у Харкаве) ён пераканаўся ў наліччы там шкодніцкае працы. Гэта было відаць па характары заказаў, якія даваліся чужаземнымі фірмамі.

У 10 г. увеч. пасяджэньне было спынена.

Ранішняе пасяджэньне 2-га чэрвеня было занята далейшым допытам Башкіна. Прадстаўнікі абароны задаюць Башкіну некалькі запытаньняў, зьвязаных з абвінавачаньнямі. Адказваючы на запытаньні, Башкін, між іншым, выяўляе, што энэргія электрастанцыі выкарыстоўвалася ня толькі пераважальна, але і вырашна шкодніцкі. Электр[illegible] перагружаўся. Гэта на [illegible]

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ.

10 год на варце савецкае дыплёматыі.

Прывітаньні т. Чычэрыну ў дзень яго юбілею.

МАСКВА. Тав. Г. В. Чычэрыным атрыманы прывітаньні ў зьвязку з 10-цігадовым юбілеем яго дзейнасьці ад Максіма Горкага, Д. М. Кержанцава, т. т. Сьвярчкова, Языкава, Малышова, Бруханава і шмат іншых.

Тав. Чычэрыным атрыманы прывітаньні ад нямецкага пасла графа Брэйгторф-Ранцаў, польскага пасланьніка Патэка, дацкага пасланьніка Скаў, фінляндзкага пасланьніка Арці, літоўскага пасланьніка Баўтрушайціса, эстонскага пасланьніка Сельямах і іншых дыплёматычных прадстаўнікоў.

31 мая ўвечары т. Чычэрыным былі атрыманы тэлеграмы з выказам найшчырэйшых павіншаваньняў ад нямецкага міністра замежных спраў Штрэзэмана і штаб-сэкратара нямецкага міністэрства замежных спраў Шубэрта.

Тав. Чычэрыным атрыманы прывітаньні ад рабочых, чырвонаармейцаў, сялян, служачых устаноў і наркаматаў.

Тав. Калінін аб савецка-нямецкіх дачыненьнях.

МАСКВА, 1-6. 1-га чэрвеня, выступаючы на ўсесаюзным зьезьдзе калектыўных гаспадарак, т. Калінін у адказ на пастаўленае яму запытаньне ў запісцы заявіў аб савецка-нямецкіх дачыненьнях наступнае: «У зьвязку з шахцінскай справай нямецкі друк узяў няверны тон у пытаньні аб узаемадачыненьнях між СССР і Нямеччынаю. І сапраўды: ці можа ў якой-небудзь меры ўплываць на ўзрастаючую эканамічную і культурную сувязь абодвых краёў арышт некалькіх нямецкіх грамадзян у СССР, ці, наадварот, савецкіх грамадзян у Нямеччыне? Завярэньне-ж некаторых нямецкіх газэт, што арышт нямецкіх інжынэраў у СССР нібы зьвязан з шахцінскім працэсам штучна,—відавочная бязглуздасьць. Я думаю, што няма рашуча ніякіх падстаў западозрываць нямецкія фірмы ў прыналежнасьці да ўчынкаў, інкрыміную мых арыштаваным двум нямецкім інжынэрам; тым больш, няма падстаў узьняць газэтны шум навакол арышту і суду над гэтымі двума інжынэрамі.

Выйгрышы па пазыцы 1926 г.

МАСКВА. 1-га чэрвеня адбыўся тыраж выйгрышаў пазыкі 1926 г. Разыграна 850 выйгрышаў па 200 руб., 250 выйгрышаў па 300 руб., 79 па тысячы, 10 па 5 тысяч, 3 па 25 тысяч, 2 па 50 тысяч і адзін у 100 тысяч.

Выйгрышы па 5 тысяч прыпалі на такія аблігацыі: сэрыя 348 № 30, сэрыя 1593 № 22, сэрыя 3088 № 37, сэрыя 3173 № 37, сэрыя 3732 № 20, сэрыя 3916 № 4, сэрыя 4082 № 1, сэрыя 4428 № 21, сэрыя 4527 № 40 і сэрыя 4624 № 10.

Па 10 тысяч рублёў выйгралі наступныя аблігацыі: сэрыя 535 № 12, сэрыя 760 № 28, сэрыя 1550 № 17, сэрыя 4701 № 26 і сэрыя 4800 № 1.

Па 25 тысяч рублёў выйгралі: сэрыя 2251 № 24, сэрыя 2562 № 15 і сэрыя 4358 № 2.

Па 50 тысяч прыпала на аблігацыі: сэрыя 1514 № 7 і сэрыя 1364 № 46, а 100 тысяч рублёў выйграла сэрыя 4069 № 43.

Удзячнасьць савецкай грамадзкасьці ад консула Італіі.

ЛЕНІНГРАД, 1-5. У гутарцы з карэспандэнтам Роста італьянскі консул у Ленінградзе сказаў: «Я вельмі ўзрушан адносінамі савецкіх, навуковых і ўрадавых дзеячоў да справы адшуканьня экспэдыцыі Нобіле. Італьянскі ўрад і ўвесь народ з напружанаю ўвагаю і падзякаю сочаць за ўсімі захадамі савецкага ўраду і навукі».

Растрэл кулакоў-тэрарыстаў.

СІМФЭРОПАЛЬ, 1-6. Выязная сэсія галоўнага суду ў Джанкоі пасьля 5-цідзённага разгляду ўхваліла прысуд па справе аб забойстве селькора-камсамольца Прыходзькі. Забойцы—сыны кулака Конн, а таксама Якуб Ішчэнка і натхніцель забойства Качура—прысуджаны да вышэйшае меры сацыяльнае абароны—растрэлу.

ЦЬВЁРДАЛОБЫЯ ЗРЫВАЮЦЬ АНГЛА-САВЕЦКІ ГАНДАЛЬ.

ХІКС РЫХТУЕ ВЫСЯЛЕНЬНЕ З АНГЛІІ САВЕЦКІХ ГАНДЛ. ОРГАНАЎ.

ЛЁНДАН, 31-5. Палітычны карэспандэнт «Дэйлі Мэйль» паведамляе, што Джойнсон Хікс скончыў расьсьледаваньне наконт дзейнасьці аддзяленьняў савецкіх банкаў і падасьць на наступным тыдні вычэрпваючыя паведамленьні ў палаце вобшчын як ад новяцца яе заняткі. Раней, чымся выступіць у палаца вобшчын, Джойнсон Хікс падасьць аб гэтым даклад ураду, прычым, як паведамляе карэспандэнт, зазначыць, што з выяўленых фактаў магчым толькі адсін лёгічны вывад, г. зн., канчатковае высяленьне з Англіі ўсіх савецкіх арганізацый.

* * *

ЛЁНДАН, 1-VI. Прадстаўнікі савецкіх банкаўскіх устаноў у Лёндане выступілі з заявамі наконт паведамленьняў «Дэйлі Мэйль» аб выніках праведзенага міністэрствам унутраных спраў Джонсонам Хіксам расьсьледаваньня дзейнасьці гэтых устаноў. Заявы адказваюць на цэлы шэраг паклёпных абвінавачаньняў, якія высунуты ў рэакцыйным друку.

„Манчэстэр Гардыян" друкуе перададзеную лёнданскім карэспандэнтам газэты заяву аб ведамленае асобы, імя якое газэта не называе. У заяве, між іншым, гаворыцца: „Гэта не сакрэт, што Камінтэрн фінансаваў ангельскую камуністычную партыю. Камінтэрн сам публічна паведаміў аб гэтым і камуністычная партыя падцьвядзіла гэта два ці тры месяцы назад. Але меркаваньне, што савецкія гандлёвыя арганізацыі ўдзельнічалі ў гэтай апэрацыі, або што фінансавалася палітычныя арганізацыі ў Англіі, зусім пазбаўлена грунту. Пакольні гандаль з Расеяй мае вядомае значэньне і ідзе да палепшаньня, дык тыя, хто зацікаўлен у гэтым гандлі, павінны былі-б наглядаць за міністэрствам унутраных спраў і ня быць вельмі наіўна-даверчывымі".

ФАШЫСЦКА-МЕНШАВІЦКІ ВЫКЛІК НЯМЕЦКІМ РАБОЧЫМ.

БЭРЛІН, 31-5. У зьвязку з парадам, назначаным фашыскай арганізацыяй «Сталёвы Шлем» у Гамбурзе на 3 чэрвеня, нямецкая камуністычная партыя і чырвоны саюз франтавікоў пастанавілі правесьці 1 га чэрвеня контрдэманстрацыю. Аднак, кіраўнік гамбурскае паліцыі сацыял-дэмакратычны сэнатар Шэнфэльдэр, нічым не абгрунтоўваючы сваю пастанову, забараніў рабочую контр-дэманстрацыю.

Рабочыя масы Гамбургу, не зважаючы на абарону, якую дае нямецкая сацыял-дэмакратычная партыя «Сталёваму Шлему», энэргічна рыхтуюцца да адпору. Рабочыя ўсіх тых гарадоў, адкуль члены „Сталёвага Шлему", карыстаючыся фінансавым падтрыманьнем буйных прамысловцаў і аграрыяў, накіроўваюцца ў Гамбург, рыхтуюцца таксама да арганізацыі дэманстрацыі пратэсту проці параду «Сталёвага Шлему».

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

ЯК У ПОЛАЧЧЫНЕ ПАДРЫХТАВАЛІ ЗРЫЎ КАНТРАКТАЦЫІ ЛЁНУ.

У той час, як усюды амаль закончыўся пасеў лёну, Полацкая акруга ледзь расчухалася. 15 мая Акрземаддзел рашыў такі паправіць свае абмылкі, якія яму трэба было прадбачыць яшчэ ў студзені ці ў лютым. Свае ўнутраныя загатоўкі акруга праваронила. Да 5 мая ў с.-г. каапэрацыі былі забраніраваныя запасы ільнянага насеньня. Зараз-жа, у выніку такой мудрай палітыкі, у акрузе ня будзе выканан плян на кантрактацыю лёну на 600 гэкт., бо няма насеньня.

Зараз яны лямантуюць, каб дазволілі завезьці ў Полацкую акругу абы якое насеньне, але гэтага ня можа дазволіць Наркамзем, бо ў Полацкай акрузе ня можна дазволіць разьвядзеньне гатункаў лёну з паўднёвых ці нават цэнтральных округаў.

Адказнасьць за гэту бязглуздасьць павінна панесьці Полацкае Акрза.

ХІБЫ БУДАЎНІЦТВА У ГОМЕЛІ.

Не хапае будаўнічага матар'ялу. Жылсаюз дапамагае прыватнікам.

Правядзенае Акргандлем абследаваньне рынку будаўнічых матар'ялаў выявіла, што нашыя будаўнічыя арганізацыі нездавальняюча забясьпечаны будаўнічым матар'ялам. У больш спрыяючым становішчы знаходзіцца Жылсаюз, які сваячасова загатаваў матар'ялы. Белпайгандаль з заказаных 22-х вагонаў бляхі для дахаў атрымаў толькі—6 вагонаў, з прычыны чаго прамысловасьць ня можа быць поўнасьцю забясьпечана бляхай для дахаў. Адсутнічае аліва і няма пэрспэктыў на атрыманьне. З гэтае прычыны затрымліваецца рэалізацыя сухіх фарбаў. Лесаматар'ялам забясьпечаны, але па якасьці ён не адпавядае.

Пры праверцы цэн, выкрыта шмат парушэньняў у аддзяленьні Цэнтразмскладу. Аддзяленьне практыкавала высокія налічэньні пры водпуску тавараў, ільготы ўраду пры будаўнічых арганізацыях, Цэнтраземсклад розными налічэньнямі выкарыстоўваў для адтрыманьня ліхвярскіх прыбыткаў. Аддзяленьне выдавала тавары па цэнах Менску, значна перавышаючых цэны ў Гомелі.

Былі дапушчаны ненармальнасьці пры продажы будаўнічых матар'ялаў. Жылсаюз меў ліпкі бляхі для дахаў, якія ён выдаваў індывідуальным застройшчыкам па запісках прафэсыянальных арганізацый. Пры такім мэтадзе бляху атрымлівалі ня тыя, хто адчуваў найбольшую патрэбу ў ёй. Выкрыты выпадкі выдачы Жылсаюзам і Белпайгандлем прыватнікам цьвікоў і рознага жалеза, якія выкарыстоўвалі напружанасьць становішча з памянёным таварам у мэтах спэкуляцыі.

КААПЭРАЦЫЯ ПЧАЛЯРОЎ РАСЬЦЕ.

МАГІЛЕЎ, 2-VI. Толькі-што арганізаваліся яшчэ тры пчалярныя таварыствы—Журавіцкае, Шклоўскае і Быхаўскае. Цяпер у кожным раёне, акрамя Чачэвіцкага, ёсьць пчалярныя таварыствы. У Шклоўскім раёне маецца нават два таварыствы. Лупалаўскія і магілёўскія пчаляры аб'яднаны ў адным т-ве.

Сёлета ўпершыню быў арганізаваны каапэрацыйны збыт мёду, і кожны пчаляр меў магчымасьць прадаць свае лішні.

Увесь час магілёўскі гарадзкі спажывец атрымлівае добраякасны каапэрацыйны мёд, які прадаецца па нізьменнай цане (30 кап. за фунт). Частка загатоўленага таварыствамі мёду пайшла на выраб мядовага віна на заводзе Чырвонага Крыжу.

Наладжаны збыт спрыяе разьвіцьцю пчалярства.

Палепшаньню тэхніні пчалярства дапамагаюць створаныя ў шмат якіх вёсках пчалярныя гурткі. Дзякуючы іх працы і дапамозе адбыўся масавы перагон пчол з халодных вульляў у рамачныя і іншыя палепшаньні ў пчалаводнай тэхніцы.

На чарзе—стварэньне пчалярных арцеляў.

ПАБУДОВА НОВАЙ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ.

Гомель, 2-6. На папаровай фабрыцы «Гэрой Працы» ў Добрушы, дзе зараз працуе каля 1676 рабочых, сёлета будзе будавацца новая электрычная станцыя. На пабудову гэтай электрастанцыі асыгнавана 200000 р.

1-га КАСТРЫЧНІКА БУДЗЕ ПУШЧАН ТАЛОЧЫНСКІ КРАХМАЛЬНЫ ЗАВОД.

Ворша, 2-6. У сучасны момант пабудова будынку для буйнага крахмальнага заводу ў Талочыне закончана.

Зараз праводзіцца ўстаноўка машын і станкоў.

Наогул, завод абсталяваны і мэханізаваны лепшымі замежнымі машынамі.

За сэзон завод будзе пераапрацоўваць 500000 пуд. бульбы.

1 кастрычніка гэты завод запрацуе.

Прыняты меры к таму, каб завод працаваў пры 7-гадзінным рабочым дні.

23000 РУБ. НА РАМОНТ ШКЛЯНОГА ЗАВОДУ «ТРУДЫ».

Полацак, 2-6. Гэтымі днямі стаў і спыніў сваю працу з прычыны рамонту шкляны завод «Труды».

На заводзе будзе праведзен капітальны рамонт.

На рамонт заводу Беларускі Шкляны Трэст адпусьціў 23000 р.

«ГОРКАЯ» ЗЬНІШЧЫЛА ШКОЛУ.

МАГІЛЕЎ, 2-VI. Сасновіцкі каапэратыў парашыў зарабіць на... рускай горкай. Для гэтай мэты выехаў на сьвята Ушэсьця ў вёску Высокі Барок, дзе ў гэты дзень—кірмаш, і адчыніў гандаль у школьнай пуні. «Падмацаваўшыяся» гэткім каапэрацыйным таварам, хуліганы падпалілі пуню. З пуні агонь перайшоў на школьны будынак, які таксама згарэў.

Хлеб прадалі спэкулянтам.

Ворша 1-VI. Адміністрацыя Ляднянскага спаж. т-ва вясной закупіла для сваіх пайшчыкаў 30 вагонаў хлебнай мукі. Пайшчыкі радаваліся, што будуць з хлебам.

Але праз некалькі дзён хлеб быў пушчан направа і налева. Спэкулянты, якія раней прадавалі па 3 р. 80 к. за пуд муку, накуплялі па 1000 пуд., як напр., пехта Гліцын і іншыя. Куплялі хто хацеў.

Зараз кожны дзень у праўленьні спажывецкага т-ва стаяць па 15—20 чал. пайшчыкаў сялян, каб купіць 1—2 пуд. мукі, але загадчык труба адказвае —«няма хлеба»...

4 агнятрывалыя будынкі для малочных арцеляў.

Магілеў, 1-VI. Летась у акрузе пабудавана малочнымі арцелямі 5 бэтонных будынкаў для сваіх заводаў. Сёлета-ж будынкі будуюць Махаўская, Сіўкава - Галінецкая, Галынецкая і Тросьліўская арцелі.

НА АСІНАСТРОЇ.

ВОРША, 2-VI. Акруговай камісіяй па абсьледваньню жыцьця рабочых на Асінаторої выкрыта, што калектыўны дагавор на выконваўся Белдзяржтроем. Рабочыя знаходзяцца ў нізкіх санітарных, бытовых і бытавых умовах.

У цесна-набітых бараках грязь, вошы. Вецер разгульвае, нібы ў полі. Зьявілася малярыя сярод рабочых-каменьшчыкаў в. Агародні, Гомельскай акругі. Яны працавалі ў мінулым годзе ў малярыйнай мясцовасьці, Харкаўскай губ.

Праз тыдзень было зроблена паўторнае абсьледваньне, якое заўважыла некаторае палепшэньне жыцьця рабочых. Мэдыцынская дапамога ў Выдрыцы значна пашырана. Акрздрав'ем арганізаваў у в. Арэхах фэльчарскі пункт, у які наніроваи сталы ўрач. Пакуль-што дрэнна абстаіць справа з памяшканьнем для прыёмнага пакою.

Камісіяй зроблены адпаведныя ўказаньні арганізацыям аб палепшаньні жыцьця рабочых.

Хутка адбудзецца абсьледваньне торфараспрацоваи.

У далейшым будуць праводзіцца абавязковыя мэдыцынскія агляды ўноў прабываючых рабочых і арцеляй.

ЗА П'ЯНСТВА, КАЗЁНШЧЫНУ І ПРАТЭКЦЫЯНІЗМ—КАРА.

(*Па тэлярфону ад нашага карэспандэнта*).

Гомель. Згодна пастановы бюро акруговага камітэту партыі і прэзыдыуму акруговае Кантрольнае Камісіі за дапушчэньне сыстэматычнага п'янства ў партыйных арганізацыях Буда-Кашалёўскага раёну, за фармальнае казённае партыйнае кіраўніцтва (наладжаньне выключна зачыненых партыйных сходаў, адрыў у пераважаючай большасьці ад беспартыйнае масы)—зьнімаюцца з працы сэкратар райкому партыі Паповіч з абвяшчэньнем выгавару, і старшыня РВК Мароз, таксама з абвяшчэньнем выгавару. Лясны аб'езчык Скачок за п'янства, пратэкцыянізм (прыстроіў заможнага цесця на працу) і за грубыя абыходзіны з сялянствам выключаецца з партыі. Справа Скачка з абвінавачаньнем у грубых абыходзінах з сялянствам перададзена пракурору для прыцягненьня да судовае адказнасьці.

Цэламу раду таварышоў будзе абвешчан выгавар.

На бліжэйшай раённай партыйнай канфэрэнцыі будзе пастаўлен спэцыяльны даклад АКК.

БУДАЎНІЦТВА Ў МАЗЫРЫ ПАД ПАГРОЗАЙ ЗРЫВУ.

Мазыр, 2-VI. *Ня гледзячы на шэраг папярэджаньняў і вызначэньня цьвёрдага тэрміну—будаўнічыя працы (за выключэньнем грамадзкіх) у Мазыры не пачаліся. Дагэтуль адсутнічаюць пляны работ. Несваячасова пачалася загатоўка будаўнічых матар'ялаў.*

Рабочыя будаўнікі дагэтуль ня маюць працы і рыхтуюцца да выезду з гораду. Гэта стварае пагрозу, што будзе недахват кваліфікаванай рабочай сілы ў час разгортваньня будаўніцтва. Намечаная выпрацоўка пустацелай цэглы на пабудову вялікага дому для рабочых ідзе слаба і стварае небясьпеку зрыву пабудовы гэтага дому ў сёлетні сэзон.

Пазыка ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі

31-га мая ў г. Мазыры пачаўся тыраж 11 сэрыі пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі. А 11 гадзіне раніцы ў памяшканьні гарсавету тыражная камісія прапрацоўвала аргпытаньні, праверыла склад камісіі, у якую ўвайшло 9 сялян ад Мазырскай Бабруйскай, Магілеўскай, Карасьценскай і іншых округ. А 6 гадзіне дню тыражная камісія распачала практычную працу. Старшыня тыражнай камісіі—старшыня Мазырскага Акруговага Выканкому тав, Страле перадае членам камісіі тыражныя білеты для праверкі і ўкладкі ў патроны. Праверныя і ўкладзеныя ў патроны білеты правяраюць прадстаўнікі РСІ і сялян, кладуць у вурны, якія зачыняюць на замкі, накладваюць пячаті, пагранічнай варты войск АДПУ, а таксама ад Наркамфінаў СССР і БССР т. Гальперын, які падрабязна спыняецца на пытаньні дзяржаўнай пазыкі у СССР, аб іх распаўсюджваньні сярод працоўных мас, аб карысьці дзяржпазыкі і азнаёміў прысутных з тэхнікай тыражу і адказаў на ўсе пытаньні.

Сялянка Дземядзюк, якая выступала ад Жыткаўскага райёну, Мазырскай акругі, паведаміла, што сялянства Жыткаўскага райёну, асабліва беднякі і сяраднякі сустрэлі пазыку з радасьцю і што Жыткавіцкі райён выканаў заданьне па пазыцы на ўсе 100 проц.

Урачыстая частка скончана, [illegible] прадстаўнікі РСІ і

Агонь па бюракратызму і галавацяпству.

Гняздо пратэкцыянізму ў мэталётрэсьце.

Эканаміст Фэльдман прымае на працу толькі „сваіх мілых“ жанчын.

За «мілых» жанчын, за сваіх знаёмых эканаміст мэталётрэсту Фэльдман гатоў «палажыць» галаву. Усё яму віпачом: нават Біржа Працы, і супрацоўнікі, і начальства.

Справа пачалася з самага маленькага начальніка—статыста М.

Тав. М. быў прыняты ў мэталётрэст у лістападзе мінулага году.

Эканамісту Фэльдману гэта было не па «душы», бо ён хацеў прыняць на працу «сваіх людзей», а ня тых, каго пасылае Біржа Працы.

— Трэба пазбавіцца ад гэтых «біржавікоў»,—гаварыў Фэльдман.

Ну, раз эканаміст, чалавек значыць з галавой, то ён „мудра“ пачаў весьці барацьбу з сваімі ворагамі—„біржавікамі“.

Фэльдман пачынае весьці ганебную правакацыю супроць т. М. (статыста): лічыць яго нікудышным працаўніком, увесь час прыдзіраецца, па цэлых тыднях не даваў т. М. ніякай працы, а трымаў яго толькі на «пабягушках».

Адным словам, да т. М. Фэльдман адносіўся па-зьверску. Затое «уважительно» ён адносіўся да сваіх «мілых» жанчын. Да яго прыходзілі ў „розавых ботиках и шляпах“; Фэльдман іх з прыемнасьцю садзіў у крэсла, абяцаў прыняць на працу.

Каму радасьць, а ў беднага М. сэрца дрыжыць: яго пераводзяць на працу ў рэгістратуру, а пасьля зусім звальняюць, прычым назад прымаюць на працу ў той-жа дзень.

Фэльдман, выяжджаючы ў камандыроўку, застаўляў бронь сваім намесьнікам. Тав. М. не «давяраў». Такім чынам, бронь камандавала ўсім. Пацеха...

Біржа Працы пасылала ў мэталётрэст 5 чал., і ўсіх Фэльдман адсылаў назад. Навошта яму „біржавікі“, калі ён прыняў на працу сваю знаёмую Лізгаро.

Біржа Працы яшчэ пасылае людзей, але Фэльдман усіх адпраўляе назад.

Пасьля гэтага, Фэльдман «устраивает» сястру Лізгаро. Ён нават з ёю разам хадзіў на Біржу, каб хутчэй выхлапатаць пуцёўку (спадзяючыся на рэкамандацыю Ляўданскага з ВСНГ). Не пашанцавала Фэльдману—яго «уважаемую“ Лізгаро звольнілі ў той-жа дзень, як прынятую па пратэкцыі.

26 мая сход служачых мэталётрэсту ў сваёй рэзалюцыі цалкам пацьвердзіў усе факты пратэкцыянізму Фэльдмана і пастанавіў выключыць яго з саюзу.

А дзе была і што рабіла адміністрацыя?

Калі да кіраўніка трэсту т. Фіша зьвярнуліся сэкратар парт'ячэйкі і прадстаўнік саюзу, то т. Фіш сказаў: „пусть она работает, а потом посмотрим“.

Як відаць, т. Фіш грае ў адну дудку з Фэльдманам, а «мілыя» жанчыны „танцуют“ пад іхігру.

Спадзяемся, што на гэта гняздо пратэкцыянізму зьверне ўвагу РСІ.

З. Таганскі.

Гнойныя балячкі на здаровым целе.

ЗЬДЗЕКІ НАД СЯЛЯНКАЙ—ВЫЛУЧЭНКАЙ КАНДЫДАТАМ ЦВК СССР Т. ДУДЗІЧ У МАЗЫРШЧЫНЕ. СЯЛЯНКА Т. ДУДЗІЧ АБАРАНЯЕ АЎТАРЫТЭТ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ. БЮРАКРАТЫЗМ І ВАЛАКІТА ПАНУЮЦЬ ПА ЎСТАНОВАХ МАЗЫРШЧЫНЫ.

Кастрычнік высунуў сялянку Дудзіч на вельмі адказную працу.

Мы добра ведаем, што толькі дзякуючы Кастрычнікавай рэвалюцыі, працоўныя жанчыны гораду і вёскі атрымалі шырокую магчымасьць для прыняцьця актыўнага ўдзелу ў нашым дзяржаўным будаўніцтве.

З першых-жа дзён існаваньня савецкай улады сялянка-бяднячка в. Юркавічы, Жыткавіцкага раёну, Мазырскай акругі т. Дудзіч з галавой акунулася ў грамадзкую і савецкую працу. З году ў год т. Дудзіч за яе актыўнасьць усюды і заўсёды абіраюць на працу: яна і ў сельсавеце, яна і ў рыйвыканкоме, яна нават зарэз ужо кандыдат у члены найвышэйшай у Саюзе ўстановы—Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту СССР.

На ўсіх сходах, пасяджэньнях пленумах як сельсавету, так і райвыканкому сялянка Дудзіч актыўна выступае ў абгаварэньні ўсіх пытаньняў. Тав. Дудзіч добра ведае, чые інтарэсы яна адстайвае, і таму з яе прамоў на пленумах яскрава відаць, што яна сурова прытрымліваецца класавай лініі абароны інтарэсаў беднаты.

Вось чаму сялянка Дудзіч—кандыдат у члены ЦВК СССР—карыстаецца вялікім аўтарытэтам сярод сялянскай беднаты. Вось чаму т. Дудзіч ня толькі заўсёды абіраецца, але і выстаўленая ёю на сялянскім сходзе кандыдатура праходзіць аднагалосна.

— Наша Дудзіч кепскага чалавека ня высунс на адказную працу ў сельскіх арганізацыях,—кажуць сяляне.

Гэта т. Дудзіч разам з сялянскай беднатой паставіла пытаньне аб тым, каб у старшыні сельсавету далі ім камуніста, бо „ад камуніста будзе больш справядлівасьці“,—гаварылі яны.

Сёлета ў нас камуніст—куцьця з макам.

Дабіліся мы ў сельсавет і камуніста, але ў гэтым годзе наш камуніст—куцьця з макам—ня мае жывасьці ў рабоце,—далікатна адзначае тав. Дудзіч у сваім лісьце ў Прэзыдыум ЦВК СССР.

Чытайце далей!

З абсьледваньня інструктара ЦВК БССР відаць, што старшыня сельсавету, камуніст Ярашэвіч, падпаў пад уплыў разлажыўшыхся элемэнтаў, як аб'едзчык Тарасаў і сэкратар ячэйкі ЛКСМ—загадчык каапэрацыйнай крамы Чатырка.

Прыяцель старшыні сельсавету тав. Ярашэвіча, аб'едзчык Тарасаў—горкі п'яніца—на сходах упэўніваў у скорым падзеньні савецкай улады.

Нічога, гр. Тарасаў! савецкая ўлада жыве і будзе жыць, а вось вам дык прыдзецца, відаць, «упасьці» з пасады аб'едзчыка.

Другі прыяцель Ярашэвіча—сэкратар камсамольскай ячэйкі—таксама педалёка адышоў ад Тарасава, бо часта прамочвае горла рускай горкай і ў прысутнасьці сялян, чытаючы прысланую накладную, досыць «остроумно» адзначыў, «кепска напісалі жыдоўскія морды»...

Дудзіч вядзе барацьбу са злачынствамі.

Не падабаецца юркавіцкім «дельцам» надзвычайная актыўнасьць сялянкі Дудзіч, і свае цёмныя справы яны спрабуюць рабіць ад яе таемна.

Ведае старшыня сельсавету гр. Ярашэвіч, што т. Дудзіч зьяўляецца членам лясной камісіі, але запрасі яе на пасяджэньне—дык яна ўсю „справу“ сапсуе...

— Разьмеркавалі, лес, а мяне на пасяджэньне не запрасілі,—скардзіцца сялянка Дудзіч.

— Чую, што сяляне-беднякі шумяць, кажуць, што ў нас лес атрымаў той, хто камісіі за самагонку падабаўся. Я да старшыні, а той на аб'ездчыка Тарасава спасылаецца: так ніякага толку і не дабілася,—кажа тав. Дудзіч.

Ёсьць выпадак яшчэ цікавейшы.

Як кандыдат ЦВК СССР, тав. Дудзіч прымала ўдзел у зацьвярджэньні юбілейнага маніфэсту Саюзнага Ураду, але вось, калі па гэтаму маніфэсту ў в. Юркавічах разьмяркоўвалі сярод сялянства ільготы, дык...

— Даведалася я ад сялян, што сельская камісія ўжо скідку разьмяркоўвае. Хоць зноў ня клікалі, а прыходжу на пасяджэньне, бо справа датычыцца беднаты. Стаю, гэта я з боку—слухаю і бачу, што шмат няправільнага робіцца, дый прысутныя сяляне абураюцца:—кажуць—«з кім старшыня сельскому Барысэвіч добра выпіў, таму і скідку дае».

— У тэй камісіі былі ўсе заможныя і кожны сабе скідку зрабіў, але я паехала ў райвыканком.

У райвыканкоме з Дудзіч не асабліва лічацца.

Бачачы гэткія недарэчнасьці пры разьмеркаваньні скідачнага фонду, паехала сялянка Дудзіч у райвыканком інтарэсы беднаты бараніць, а ў райвыканкоме...

— Зноў гэта Дудзіч нам спакою не дае! Ды што зробіш? Як ні як, а ўсё-ж яна—кандыдат у члены ЦВК СССР. І каб супакоіць кабету, некаторыя зьмены ў разьмеркаваньні фонду зрабілі.

Вылучэньне „няўдалае“...

Абставіны і ўмовы працы вылучэньні т. Дудзіч вельмі кепскія, бо...

Старшыня РВК і сэкратар райкому лічаць вылучэньне т. Дудзіч у кандыдаты ЦВК СССР няўдалым.

— Яна, бачыце, не карыстацца аўтарытэтам насельніцтва і сваімі паводзінамі кампрамэтуе сябе перад сялянамі. За ёй назіраецца палавая распушчанасьць, была раз і п'янка ў хаце Дудзіч,—кажуць паважаныя прадстаўнікі партыі і ўлады Жыткавіцкага райёну.

У чым-жа вы грамадзяне, бачыце палавую распушчанасьць т. Дудзіч?

Ды вось раз пасьля сялянскага сходу т. Дудзіч а 11-ай гадзіны ўночы пашла за 7 вёрст дахаты, і падумайце толькі, ноччу і не адна, а разам з мужчынай,—таемна апавядаюць адказныя працаўнікі Жыткавіцкага райёну.

Кажаце, не карыстаецца ў сялян аўтарытэтам, і п'янкі ў т. Дудзіч наладжваюцца?

Маніце, таварышы. Абсьледаваньне інструктара ЦВК БССР сьведчыць, што і аўтарытэтам сялянства т. Дудзіч карыстаецца, і п'янак ніякіх ня было. Нават больш таго—т. Дудзіч ня толькі свой аўтарытэт падтрымоўвае, але і аўтарытэт Савецкай Улады перад сялянствам бароніць.

Хто падрывае аўтарытэт улады?

— Паехала я ў Тураўскі райён і пачала гутарыць з сялянамі пра савецкую ўладу,—кажа т. Дудзіч, а адзін сялянін і гаворыць мне:

— Годзе табе хваліць савецкую ўладу. бо няма праўды ў ёй.

— Бачу я, што ў селяніна набалела, і таму так гаворыць. Паслухай, таварыш, дакажы, чым савецкая ўлада кепская—пытаюся я ў селяніна.

— Са сялызьмі апавядаў селянін пра тое, як яго лясьніцтва прымушае некалькі разоў ехаць за купленым лесам і, урэшце, гаворыць яму, што лес яго прададзены, а яму дадуць новы. Вось і цягнуць у лясьніцтве валакіту ўжо 2 гады, а лесу і цяпер не даюць.

— Ты пішы заяву і давай сюды, а мы даведаемся, хто вінаваты—ці ўлада, ці тыя людзі, што нагана працаюць,—супакоіла селяніна т. Дудзіч і паехала ў акругу шукаць праўды.

Вы ня маеце права хадайнічаць...

Зьвярнулася т. Дудзіч да акруговага інспэктара лясоў Лысенка, а той, даведаўшыся, што за скарга гэта не яе, кінуў з рук заяву і гаворыць:

«Вы ня маеце права хадайнічаць»...

— Дарагі таварыш,—кажа сялянка Дудзіч,—селянін вельмі бедны, ня мае сродкаў прыехаць і савецкую ўладу ганьбіць,—трэба яму даказаць, што ня ўлада тут вінавата.

«Вы ня мааце права»—зноў пачуўся бюракратычны адказ, ды яшчэ прыказку сказаў інспэктар:— «шут Балакіраў пытаў другога, чаму ў яго зубы баляць, а той адказвае,—таму, што языком шмат трэплеш»...

Пашла т. Дудзіч да сэкратара акрвыканкому, а той выслухаў вылучэнку, сказаў, што кепска робяць, і запіску да інспэктара напісаў.

Культурны доктар Кантаровіч.

Скардзілася ў сваім лісьце вылучэнка т. Дудзіч, што з ёю, хворай вельмі кепска абышоўся доктар Тураўскай больніцы Кантаровіч і нават хворую з больніцы выгнаў.

Сам доктар Кантаровіч апавядае, што „ён раіў ёй паехаць лячыцца ў горад, бо баліўся, што т. Дудзіч, як цёмная сялянка, можа адкрываць павязкі і брацца брудныміі рукамі за раны, чым можа ўнесьці інфэкцыю.

А як жа, т. Кантаровіч, вы з іншымі хворымі абыходзіцеся, бо бальніца—сельская, і галоўны кантынгэнт хворых—сяляне?

Законы не пра нас пісаны...

Відаць, так разважаюць ня толькі вэтэрынары...

Вэтэрынарны фэльчар, чалавек гадоў сарака, кінуў сваю старую жонку, ашукаў маладую дзяўчыну (16 гадоў) і пайшоў з ёю а 9 гадзіне ўвечары ў сельсавет і зарэгістраваўся. Пасьля рэгістрацыі з працаўнікамі сельсавету ўсю ноч «гулял».

Бачыць т. Дудзіч, што зроблена незаконная справа, і піша заяву ў райвыканком. Урэшце, гэту справу разглядаў нарсуд і пастанавіў шлюб, як незаконны, скасаваць, і толькі...

Ні сельсавет, за незаконную рэгістрацыю, ні сам шчаслівы жаніх за ашуканства дагэтуль да адказнасьці ня прыцягнуты, а калі мы ня мыляемся, для іх павінны знайсьціся адпаведныя артыкулы ў нашым Крымінальным Кодэксе.

„Дробная“ справа.

Для высьветленьня ўсіх фактаў, якія паказаны ў лісьце т. Дудзіч, Сэкратарыят Прэзыдыуму ЦВК БССР камандыраваў у Мазыршчыну свайго інструктара т. Еліна. Па дапамогу інструктару Мазырскі акрвыканком вызначыў члена апошняга т. Пакроўскага.

Усе абураючыя злачынствы і недарэчнасьці, на якія ўказвала т. Дудзіч, аказаліся праўдай, але член Мазырскага акрвыканкому ды і сам прэзыдыум апошняга нязгодны з рэдакцыяй вывадаў абсьледваньня, бо, па думцы мазырскіх працаўнікаў, трэба яшчэ „дадатковае дасьледваньне“.

Цікава адзначыць, што ў акрвыканкоме нават выдзіліліся, што ЦВК БССР па гэткай «дробнай» справе камандыраваў свайго інструктара, але Прэзыдыум ЦВК БССР не згадзіўся з мазырчанамі: пастанавіў усіх вінаватых прыцягнуць да адказнасьці і даручыў мясцовым працаўнікам прыняць меры, каб забясьпечыць вылучэнцы т. Дудзіч таварыскія адносіны і дапамогу з боку працаўнікаў мясцовых органаў улады.

В. Зайцаў.

Драўняны бюракратызм.

Пра якія толькі недарэчнасьці сёлетняга будаўніцтва мы ня пісалі! Загатоваць на дзесяткі тысяч матар'ялу, а ён бяз толку валяецца, бо аб праэкце ў свой час не падумалі; ведаюць, што ў нас не хапае цэглы, а возьмуць і прададуць яе за межы БССР, як гэта было ў Бабруйску; часам матар'ялы загатоўлены і зацьверджаны, праэкт ёсьць, але зусім забылі, што для будаўніцтва яшчэ рабочыя чарцяжы патрэбны.

Бываюць і такія выпадкі, што ўсё гатова—і матар'ялы, і праэкты, і чарцяжы, і сродкі, але з-за месца для будаўніцтва спрэчкі ідуць, як гэта назіралі мы ў Гомелі з пабудовай заводу сельска-гаспадарчых машын.

Возьмем цяпер правядзеньне каналізацыі ў Менску.

Як вы думаеце, ці ўсё тут добра стаіць, ці без недарэчнасьці абыйдзецца гэта буйнае будаўніцтва.

У нас неяк ужо ў звычай увайшло што чым буйней будаўніцтва, тым большае галавацяпства сустракаецца.

Так вышла і з каналізацыяй...

У газетах мы чытаем, што пабудова каналізацыі пачынае разгортвацца, але адчуваецца няхват... дошчак.

Бачыце, да чаго ў нас галавацяпства даходзіць!

Спытайце любога вучня першай групы,—«чым багата Беларусь»?—і ён вам зараз-жа адкажа:—„лесам, таварыш“.

Хоць і кепска мы яшчэ вядзём лясную гаспадарку, а лесу ўсё-ж хапае, і каб няхват дошчак у цэнтры Беларусі пагражаў нармальнаму разгортваньню правядзеньня каналізацыі, дык...

Выбачайце, мы гэтага ніяк зразумець ня можам, а, урэшце...

Ці мы ня ведаем, што і ў Лесбеле ёсьць «кволенькія» чыноўнікі, якія ўмеюць пягнуць «валакітушку».

Вось і цягнуць..

В. З-ў.

Белдзяржкіно падахвочвае прыватніка.

Буфэт кіно-тэатру „Культура“ Белдзяржкіно летась здаў у арэнду прыватніку тэрмінам да 28-XII 27 г.

Інвалідны саюз, даведаўшыся аб тэрміне арэнды буфэту, пачаў хадайнічаць, каб буфэт па сканчэньні тэрміну быў здадзен у арэнду інвалідзкай арцелі № 22.

Інвалідны саюз і арцель № 22 паслалі некалькі адносін у Белдзяржкіно з просьбай здаць буфэт інвалідзкай арцелі. На адной з адносін белдзяржкінаўскае начальства палажыла наступную рэзалюцыю: „буфеты могут быть зданы по окончании договоров с теми лицами, коим эти буфеты сданы 15-XI-27 г. Га». (далей неразборчыва).

Белдзяржкіно ў рэзалюцыях піша адно, а робіць зусім другое: за тры м-цы да тэрміну перазаключыла дагавор і зноў здало буфэт таму-ж самаму прыватніку. А на адносіну НК РСІ піша, што **прыватніку буфэт здадзен таму, што з боку саюзу інвалідаў ня было заявак на арэнду буфэту**, тады як саюз інвалідаў прасіў аб здачы буфэта ня толькі Белдзяржкіно, а НКФ, і ў справе падшыта каля 10 адносін аб гэтым да Белдзяржкіно.

Як відаць, справа зусім ясная. Тут былі асобы, зацікаўленыя, каб здаць буфэт прыватніку, а не арцелі інвалідаў.

Бюро скаргаў НК РСІ ўстанавіла, што перазаключэньне ўмовы да тэрміну зьяўляецца няправільным, і запрапанавала скасаваць гэту ўмову.

Апрача гэтага, бюро скаргаў указала Белдзяржкіно па недапусьцімасьць падахвочваньня прыватніка.

З.

Ад арцелі да буйных с.-г. калектываў.

Малочная арцель узмацняе сялянскую гаспадарку.

Малочная арцель «Аб'яднаньне» ў в. **Рылаўшчына (Самахвалавіцкага р., Маншчына)** арганізавана ў 1926 годзе, у складзе 7 гаспадароў. Спачатку сялянс недагэрліва адносіліся да працы арцелі, але праз нейкі час яны зразумелі, што арцель—выгадная рэч.

Не прайшло і трох месяцаў з часу арганізацыі арцелі, як у яе ўвайшлі 24 бядняцка-сераднякія гаспадаркі, а на сёчэшні дзень арцель налічвае ўжо 36 гаспадарак. Яны маюць 72 каровы і складаюць 61 проц. усіх гаспадарак на вёсцы.

САЦЫЯЛЬНЫ СКЛАД АРЦЕЛІ.

З агульнага ліку 36 гаспадароў арцелі 4 маюць па два кані, 30—па адным кані на гаспадарку, 2 зусім ня маюць коняй. З адной каровай налічваецца 11 гасп., або 30,5 проц. агульнага складу, з двьвюма—17, або 47,2 проц., з 3-мя—5, або 14 і з 4-мя—3, або 8,3 проц. гаспадарак.

Па пасеву маем такое становішча: да 2 дзес. налічваецца 1-гасп., да 4-х—6, да 6—16, да 8—12 і да 12—1 гаспадарка.

Такім чынам відаць, што большасьць членаў арцелі беднякі і сераднякі і толькі нязначную частку (каля 3-4 гаспадарак) можна аднесьці да больш заможнай групы.

За мінулы год арцель даставіла ў Белсельсаюз 58099 літраў малака на 6321 р. 67 к.

У бягучым годзе колькасьць малака ў арцелі павялічылася ў сярэднім на 1380 літраў у м-ц. Гэтыя дасягненьні тлумачацца павялічэньнем каапэраваных кароў у вёсцы, а таксама палепшаньнем догляду малочнае жывёлы.

Малако прадаецца ў сярэднім ня больш 10,2 кап. за літр.

ПРЫБЫТКІ АД МАЛОЧНАЙ ЖЫВЁЛЫ.

Колькі селянін атрымоўвае прыбытку ў гаспадарцы ад малочнай жывёлы і якая розьніца ў прыбытковасьці паміж бядняцкай, сераднякцкай і гаспадаркамі больш заможных сялян, можна бачыць з наступных лічбаў.

Селянін, які мае 3-4 дзес. пасеву, 1-2 каровы, 1 каня, 4-6 душ сям'і па акладному лісту с-гасп. падатку яму налічваецца 200-220 руб. гадавога прыбытку. Ад прадажы малака ён у год атрымоўвае усярэднім ад 240 да 300 руб., лічачы ў сярэднім 180-200 літраў рэалізацыі малака на 20-25 руб. штомесячна.

Калі ўзяць тып больш моцнай гаспадаркі, прыкладна, з 7-9 дзес. пасеву, 3-4 каровамі, 1-2 канём і 7-8 душамі сям'і, якая мае 420-470 руб. прыбытку, дык ад прадажы малака ў год яна можа атрымаць ад 696 да 744 руб., або 58-65 р. штомесячна. Сярэдняе між гэтымі двьвюма гаспадаркамі дае ад 480 да 600 руб. гадавога малочнага прыбытку.

Гэтыя лічбы ўзяты з вучотных кніг арцелі. Яны вылічаны за студзень м-ц, калі ўдой малака бывае ня вельмі вялікі.

Вядома, што большы малочны прыбытак сялянская гаспадарка мае ў летвія, альбо вясеньня м-цы.

Вось некалькі прыкладных лічбаў, узятых яшчэ з справаздачы тэй-жа арцелі за 1926-27 год на месяцах.

За кастрычнік здадзена, напрыклад, 4772 літры малака, за лістапад—2959, за сьнежань—3446, за сакавік—9815, за май—12201 літр і г. д.

Вядома,—дасканала вылічыць, як месячны так і гадовы малочны прыбытак вельмі цяжка, бо гэта галіна прыбытковасьці мае цесную сувязь з становішчам гаспадаркі наогул. Ад таго, колькі селянін трымае сьвіней, гусей, курэй, або іншай жывёлы залежыць уся прыбытковасьць яго гаспадаркі і таксама прыбытковасьць малочнай жывёлы.

Да гэтага часу арцель атрымала 638 р. 60 к. доўгатэрміновага крэдыту, які выкарыстоўваецца ёю для пабудаваньня ў вёсцы памяшканьня зьлічэннага пункту і пажарнага дэпо. Пабудова апошняга—ужо на палову скончана. Засталося толькі палажыць падлогу і столь.

АСНАЎНЫ КАПІТАЛ ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА.

Летась арцель атрымала чыстага прыбытку 145 руб., якія пашлі на павялічэньне аснаўнога капіталу арцелі, культурныя патрэбы вёскі і на часовае крэдытаваньне сялян-бяднякоў. У гэтым годзе ёсьць надзея атрымаць чыстага прыбытку каля 400 руб. і ўцягнуць у склад арцелі бядняцкую частку насельніцтва вёскі.

Пад уплывам арцелі сяляне пачалі займацца травасеяньнем і асабліва кораньплодамі, чым раней займалася зусім нязначная частка гаспадароў.

АД АРЦЕЛІ—ДА БУЙНЫХ С.-Г. КАЛЕКТЫВАЎ.

Дзейнасьць арцелі абхапляе і сялян суседніх вёсак. Так, у вёсцы Малінаўка спачатку арганізавалася аддзяленьне Рылаўшчынскай арцелі, а ў сучасны момант там ужо склалася самастойная арцель.

Разьвіцьцё малочнае гаспадаркі пад кіраўніцтвам сельска-гаспадарчай каапэрацыі прыводзіць да аб'яднаньня нарасобных дробна-ўласьніцкіх гаспадарак у калектывы, калгасы. У Рылаўшчыне два гаспадары аб'ядналі свае гаспадаркі і жывуць супольна. Яны ставяць сабе задачу павесьці выключна малочную справу і арганізаваць калектыўную гаспадарку.

Вось тыя першыя крокі па шляху каапэрыраваньня с.-гаспадаркі, па якім пойдзе сялянства. Ад дробных гаспадарак да аб'яднаньня ў малочную арцель, а пасьля да буйных калектыўных гаспадарак.

А. К.

ДА ПАСТАНОЎКІ ў БДТ-2 „КАЛІ СЬПЯВАЮЦЬ ПЕУНІ“.

(Гутарка з пастаноўшчыкам п'есы т. М. Міцкевічам).

Па думцы рэжысуры, пастаноўка павінна вырашыцца ў пляне сацыяльнай сатыры. У сцэнах «дзейнасьць» лідэраў нямецкіх с.-д. павінна набліжацца да вострасьці гратэску, у сцэнах рабочых яна пададзена ў рэалістычнай праўдзівасьці. Але абедзьве лініі пры сустрэчы дапаўняюць адзіную думку пастаноўкі.

Пачынаючы з выяўленьня сцэн індывідуальнага характару з вялікім эмоцыянальным насычэньнем у барацьбе паміж міліянэрам і лідэрамі с.-д. партыі з аднаго боку, і паасобнымі рабочымі—з другога боку, пастаноўка мае сваё вырашэньне ў масавай сцэне сходу рабочых, дзе лінія барацьбы праз прысуд рабочае масы афармляецца, як яскрава выяўленае клясавае змаганьне.

Каб падкрэсьліць вострасьць элемэнтаў сатыры і ў надворным афармленьні паказу будзе па меры магчымасьці граць сама рэч, характэрная для тае ці іншае асобы ці характэрнае, як сацыяльнае і бытавое зьявішча.

Музыка паказу выконвае і чыста службовую ролю (Чарльстон, сцэна ў піўной) павінна ўзмацніць і дапамагчы ўстрыманьню некаторых найбольш адказных момантаў пастаноўкі.

ТОРФ І СЯЛЯНСТВА.

ШЫРЭЙ ДАРОГУ ТОРФУ У СЯЛЯНСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ.

Торф—таннае і каштоўнае ўгнаеньне.

Мы ўжо казалі *), што Беларусь мае звыш двух міліёнаў гэктараў балот. З гэтых балот толькі зусім нязначная частка распрацоўваецца на паліва, галоўная-ж часьць тарфяных балот застаецца зусім нескарыстанай.

Балоты з году ў год растуць, нярэдка ахопліваюць палі, лугі і лясы і ператвараюць іх у няўжыткоўныя, кінутыя землі.

Галоўная прычына малага карыстаньня торфам у сялянскай гаспадарцы—невнаёмства большасьці сялян-земляробаў з торфам, яго карыснымі ўласьцівасьцямі і якасьцямі.

А ў сапраўднасьці торф з посьпехам можа быць скарыстаны ў сялянскай гаспадарцы, як угнаеньне. Гною-ж у нас пахаць атрымлівае заўсёды недастаткова.

Акрамя таго, торф можа ісьці на падсьцілку жывёле замест саломы; тарфяная падсьцілка лепей, чым саламяная і дае эканомію ў корме, таму што салома можа быць скормлена жывёлай.

Для Беларусі ўжываньне тарфянога ўгнаеньня ў сялянскай гаспадарцы мае вялікае значэньне.

Глебы Беларусі ці вельмі цяжкія, халодныя, гліністыя, ці вельмі лёгкія, пясчаныя; часта мы сустракаем лясныя (падзолістыя) глебы. Усе яны патрабуюць **моцнага ўгнаеньня гноем**, таму што вельмі бедны арганічнай (згараемай) матэрыяй, а складаюцца ў большай часьці з гліны, пяску, г. зн. рэштаў мінэралаў, з якіх яны створаны.

Торф-жа амаль цалкам складаецца з арганічнай (згараемай) матэрыі, і таму скарыстаньне яго ў Беларусі, як угнаеньня, прыняце вялікую карысьць, асабліва пры недахваце гною ў сялянскай гаспадарцы.

Паміма арганічнай (згараемай) матэрыі, торф мае ў сябе **попел**, у якім знаходзяцца спажыўныя часткі для расьлін. У торфе лугавых балот (нізінных) маецца арганічнай матэрыі каля 90 проц. і попелу каля 10 пр. Іншымі словамі, у кожных 100 пуд. лугавога торфу маецца каля 90 пудоў арганічнай матэрыі і каля 10 пудоў попелу. У мохавым торфе (з мохавых балот) попелу маецца менш — на 100 пуд. торфу ад 2 да 6 пуд.

Акрамя таго, у арганічнай матэрыі торфу маецца **азот**, неабходны харч дзеля расьлін, які мы даём звычайна ў гнаі. Азоту на 100 пуд. торфу прыходзіцца ад 2 да 4 пуд.

Такія карысныя ўласьцівасьці торфу.

Але ў большасьці выпадкаў спажыўныя матэрыі для расьлін, якія знаходзяцца ў торфе, дрэнна прымаюцца расьлінамі. Каб зрабіць іх даступнымі для расьлін, а торф зрабіць больш спажыўным, яго **неабходна праветрываць** альбо **кампасціраваць**, г. зн. зьмяшаць з рознымі адкідамі хатняй гаспадаркі. Гэткімі адкідамі гаспадаркі, якія могуць быць скарыстаны для кампосту, зьяўляюцца: сьмяцьцё, памыі, расьлінны і дрэўны попел, птушыны памёт, гной дробнай жывёлы, вапна і нават фасфарытная мука.

Такім чынам, **кампост** зьяўляецца як-бы фабрыкай, якая перапрацоўвае адкідкі гаспадаркі ў прадукты вялікай каштоўнасьці ўгнаеньня, замяняючыя гной.

Разам з гэтым, кампост зьяўляецца і капілкай спажыўных матэрыяў для расьлін, якія знаходзяцца у адкідках гаспадаркі і якія часта выкідваюцца на дарогу, ці дзе небудзь у сядзібе, на двары і толькі пагаршаюць умовы жыцьця сялян і іх сем'яў. Адным словам, спажыўныя, угнаіцельныя матэрыі часта ў гэтых выпадках прападаюць дарма.

Маючы-ж торф і падрыхтоўваючы для яго кампост, кожны селянін, зусім ня трацячы грошай, можа атрымаць ўгнаеньне, якое цалкам замяняе жывёльны гной, колькі-б яму не патрабавалася для пахаці.

Трэба толькі памятаць, што сьвежы торф, толькі што вынуты з балота, **нягодны для ўгнаеньня**; каб ён быў карысным, яго трэба абавязкова праветрыць. Гэта робіцца зусім проста: торф з балота складваецца ў кучы тоўстым слоем, лепей за ўсё на пахаці каля поля, якое трэба ўгнаіць, і час ад часу перакапываецца, пераварачваецца, пералапачваецца, як звычайна гавораць.

Ужываецца торф як угнаеньне ў тэй-жа колькасьці, што і гной.

Акрамя торфу—гэтай чорнай, зямлістай масы з балот, для сельскай гаспадаркі можа быць скарыстан верхні, сьвежы, валакністы слой мохавых балот, «журавінны (белы) мох», як яго называюць, можна з посьпехам ужываць **як падсьцілку для жывёлы.**

Калі параўнаць звычайную саламяную падсьцілку для жывёлы і мхавую—з белага моху,—то апошняя аказваецца многа лепшай, і вось чаму:

1. Тарфяная ці мохавая падсьцілка ўпітвае ў сябе вадкасьці ў 3—4 разы больш, чым салома. Нагэтаму на жывёльных дварох, дзе ёй карыстаюцца, заўсёды суха. Гнойная жыжка, якая мае многа спажыўных матэрыяў для расьлін не прападае дарма, не сьцякае з двара, ня трацціцца для гаспадаркі, а ідзе ў гной і робіць яго больш каштоўным.

2. Тарфяная падсьцілка зьнішчае дрэнны пах стайняў, у якіх маюцца таксама спажыўныя матэрыі для расьлін (пах нашатырнага сьпірту), жывёла адчувае сябе лепей, не хварэе вачмі і запаленьнем дыхацельных органаў.

3. Тарфяная падсьцілка перашкаджае разьвіцьцю зародышаў хвароб (мікробаў) і добра ўжо цяпер вядома, што жывёла, якая стаіць на мохавай падсьцілцы, менш хварэе ад заразьлівых хвароб, чым жывёла, якая стаіць на саламянай падсьцілцы.

4. Тарфяная падсьцілка, калі блізка мохавае балота, можа быць загатоўлена ў любой колькасьці, а салома, якая маецца ў гаспадарцы, можа пайсьці на корм жывёле і іншыя гаспадарчыя патрэбы.

5. Тарфяная падсьцілка дае добры, каштоўны і дробны гной у вялікай (у любой) колькасьці, які лягчэй заворваецца і мае больш харчу для расьлін, чым саламяны гной.

6. Тарфяная падсьцілка менш небясьпечна для пажараў, чым саламяная. Торф загараецца трудней, чым салома.

Тарфяны гной палепшае глебы, якія ім угнойваюцца. Гліністыя глебы робіць болей рыхлымі і цёплымі, а пясчаныя —зьвязвае. Тарфяны гной утрымлівае больш **азоту**, чым саламяны, і мацней павышае ўраджай збожжа і другіх палявых расьлін, чым звычайны гной.

Такім чынам, ня зусім цяпер верна прыказка—«мала гною—мала хлеба», «мала хлеба—мала жывёлы», «мала жывёлы—мала гною». Калі ў нас мала гною, то мы яго можам атрымаць колькі хочам, абы толькі ўжываць торф у сялянскай гаспадарцы, як угнаеньне і як падсьцілку.

Падрыхтаваньне тарфяных угнаеньняў.

Работа па падрыхтаваньню тарфянага ўгнаеньня—тарфянага кампосту нецяжкая і даступна кожнаму, калі маецца блізка торф, а ў Беларусі гэта, зразумела, усюды даступна.

Гэта работа—у наступным: на выбарнай пляцоўцы для закладкі кампостнай кучы, прывезены воз торфу зьмешваецца з адкідамі ў гаспадарцы (на кожныя 80 п. торфу 1 п. фасфарыту) і складаецца ў кучу каля 1 саж. удоўж; даўжыня кучы залежыць ад таго, колькі хочуць загатовіць угнаеньня: чым больш трэба ўгнаеньня, тым даўжэй робіцца куча.

Верхняя часьць кучы робіцца ў відзе даху, з пакатымі бакамі; вышыня кучы звычайна 2—2 спал. арш. Матар'ял, які ідзе ў кучу—торф, адкіды гаспадарак—спачатку зьмяльчаюць.

Пляцоўка, на якой закладаецца кампост, выбіраецца блізка ўгнойваемага зучастку альбо на сядзібе—паблізу месца атрыманьня адкідаў. Гэту пляцоўку ўтрамбоўваюць глінай і накапываюць няглыбока канаўкай, каб дажджавая вада не вымывала з кампосту спажыўных матэрыяў.

Агляд за кампостнай кучай заключаецца толькі ў тым, што яе часамі перакапваюць, пералапачываюць: чым часьцей, тым лепш.

Кампост лічыцца гатовым, калі ўся масса, з якога ён падрыхтован, зробіцца аднароднай і рыхлай.

Гледзячы па таму, з чаго падрыхтоўваецца кампост, час яго пасьпяваньня хістаецца ад 2 мес. да 1 году. Больш павольна пасьпявае мохавы торф.

Для падрыхтаваньня тарфяных кампостных угнаеньняў **трэба захоўваць наступныя правілы:**

1. Закладваць тарфяныя кампостныя кучы лепей за ўсё рана ўвесну: торф вывозіць к месцу закладкі кампосту ўзімку.

2. Кампосты з фасфарытам і вапнай гатовяць з мохавога торфу, бо з лугавым торфам, які ўтрымлівае звычайна дастаткова вапны, няма сэнсу кампасціраваць. Фасфарыту кладуць 1 пуд на 80 п. торфу, вапны-ж ад 1 да 2 п. на 40 п. торфу.

Лугавы торф уносяць як арганічную (згараемую) матэрыю, багатую азотам, заражаюць яго невялікай колькасьцю гною і кампансьціруюць з попелам (на 40 п. торфу 1 п. попелу).

3. Загатаўляецца кампостнага ўгнаеньня звычайна разы ў паўтара болей чым трэба, прымаючы пад увагу яго ўсушку і страты пры перавозцы на поле.

4. Тарфянае ўгнаеньне вывозіцца ў поле ў той-жа час, калі звычайна вывозяць і гной.

Пры ўжываньні тарфянай падсьцілкі неабходна кіравацца наступным:

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

Пастанова

Цэнтр. Выкан. Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра зьмену і дапаўненьне Зямельнага Кодэксу БССР.

Каб прыблізіць да насельніцтва, спросьціць і прысьпешыць землеўпарадкаваньне і разгляд зямельных спрэчак, наводле пастановы VIII-га Усебеларускага Зьезду Саветаў за 12 красавіка 1927 году па дакладу Народнага Камісарыяту Земляробства (З. З. БССР 1927 г., № 49, арт. 262), Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

I. Артыкулы 150, 161, 163, 164, 166, 173, 195—197, 199 і 200 Зямельнага Кодэксу БССР запісаць у наступнай рэдакцыі:

„150. Землеўпарадчыя работы выконваюцца пад агульным наглядам і кантролем Народнага Камісарыяту Земляробства зямельнымі органамі праз каморнікаў-землеўпарадчыкаў альбо праз сельскія саветы.

Катэгорыі землеўпарадчых работ, якія выконваюцца праз сельскія саветы, і парадак іх выкананьня ўстанаўляюцца Народным Камісарыятам Земляробства.

161. Землеўпарадкаваньне праводзіцца ў такім парадку:

1) распачацьце землеўпарадчае справы;

2) правядзеньне землеўпарадчых работ, складаньне праэкту землеўпарадкаваньня і паказ яго ўдзельнікам землеўпарадкаваньня;

3) зацьверджаньне землеўпарадчага праэкту і выкананьне яго.

163. Хадайніцтвы аб землеўпарадкаваньні на землях працоўнага карыстаньня павінны правярацца прадстаўніком райённага выканаўчага камітэту, які ўстанаўляе:

а) законнасьць хадайніцтва;

б) колькасьць зямлі і двароў, якія павінны быць землеўпарадкаваны;

в) галоўнейшыя падставы праэктуемага землеўпарадкаваньня і форму землякарыстаньня, якая выбіраецца.

164. Пасьля разгляду матар'ялаў і праверкі хадайніцтва аб землеўпарадкаваньні райённы выканаўчы камітэт уключае справу ў плян работ альбо адмаўляе ня праводзіць, калі знойдзе землеўпарадкаваньне неэтазгодным.

Скаргі на адмову райённага выканаўчага камітэту правесьці землеўпарадкаваньне падаюцца ў зямельны аддзел акруговага выканаўчага камітэту не пазьней 2-х тыдняў ад дня абвяшчэньня пастановы.

166. Землеўпарадчымі работамі зьяўляюцца: адмежаваньне належачае да землеўпарадкаваньня зямлі, выясьненьне зямельных праў удзельнікаў землеўпарадкаваньня, гаспадарча-тэхнічнае абсьледваньне маёмасьці, дзе праводзіцца землеўпарадкаваньне, параўнаўчая расцэнка зямель і адвод дзялянак паасобным землякарыстальнікам (сельска-гаспадарчым камунам, арцелям, паселкам і дварам) пры ўнутрысяленным землеўпарадкаваньні з забясьпечаньнем інтарэсаў незаможных гаспадарак; узгадненьне пажаданьняў удзельнікаў землеўпарадкаваньня без парушэньня гаспадарча-тэхнічных правіл землеўпарадкаваньня.

Увага. У землеўпарадкаваньні па запрашэньні землеўпарадчыка ўдзельнічаюць агрономы, мэліяратары і іншыя спэцыялісты.

У расцэнцы зямельных угоддзяў і у разьмеркаваньні зямель паміж удзельнікамі землеўпарадкаваньня для правядзеньня клясавай лініі і абароны інтарэсаў беднаты абавязкова ўдзельнічае прадстаўнік райённага выканаўчага камітэту.

167. Калі пры адмежаваньні зямлі, якая павінна быць упарадкавана, ёсьць значныя спрэчкі, то землеўпарадчык складае праэкт вырашэньня гэтых спрэчак і накіроўвае яго з усімі матар'ялямі ў зямельную камісію для безадкладнага вырашэньня справы. Зямельная камісія, выносячы рашэньне, можа дазволіць адразу выкананьне яго. У гэтым разе скаргі на рашэньне зямельнае камісіі разглядаюцца разам з землеўпарадчым праэктам.

168 Пасьля правядзеньня землеўпарадчых работ, землеўпарадчык піша праэкт землеўпарадкаваньня, у якім павінна быць паказана:

а) калі, дзе, на якой падставе і якія іменна землеўпарадчыя работы выкананы;

б) кароткае гаспадарча-эканамічнае абгрунтаваньне праэкту;

в) удзельнікі землеўпарадкаваньня;

г) каму, для якой патрэбы і дзе даюцца дзялянкі, разьмер гэтых дзялянак і паасобных складаючых іх ужыткаў;

д) з якога часу і на якіх умовах удзельнікі землеўпарадкаваньня павінны карыстацца зямлёю паводле праэкту;

е) якія асобныя правы і абавязкі, зьвязаныя з атрыманымі паводле праэкту землямі, даюцца землякарыстальнікам і ўскладаюцца на іх;

ж) каму, ад каго і якая іменна сплата належыць за затраты на палепшаньне адведзенай пры землеўпарадкаваньні зямлі;

з) іншыя важныя зьвесткі пра землеўпарадкаваньне даная тэрыторыі.

169. Заінтэрэсаваныя ў землеўпарадкаваньні насельніцтва да выкананьня праэкту ва ўстаноўленым парадку павінна карыстацца зямлёю ў межах, існаваўшых перад пачаткам землеўпарадкаваньня. Вінаватыя ў парушэньні гэтага артыкулу адказваюць, як за самаўпраўства.

170. Праэкт унутрысяленнага і міжсяленнага землеўпарадкаваньня пасьля праверкі яго каморнікам-рэвізорам паказваецца землякарыстальнікам і адначасна разглядаецца на месцы вядзеньня работ зямельнай камісіяй. Насельніцтва павінна быць паведамлена пра час, калі праэкт будзе паказан.

Пры паказе праэктаў іншых відаў землеўпарадкаваньня зямельная камісія можа ня прысутнічаць.

171. Зямельная камісія, разглядзеўшы землеўпарадчы праэкт і зьвязаныя з ім спрэчкі і скаргі, альбо зацьвярджае праэкт бяз зьмен, альбо робіць зьмены, калі яны не патрабуюць перасклада́ньня праэкту, альбо даручае землеўпарадчыку скласьці новы праэкт з паказаньнем прычын, якімі выкліканая перасклада́ньне.

172. З праэктамі гаспадарчага ўпарадкаваньня, складзенымі на падставе зацьверджаных зямельнымі камісіямі праэктаў групавога землеўпарадкаваньня, землеўпарадчыкі азнаямляюць кожнае новае сельска-гаспадарчае аб'яднаньне ў паасобку ў прысутнасьці прадстаўніка сельскага савету. Зямельная Камісія такіх праэктаў не зацьвярджае:

173. Набыўшая законную сілу пастанова зямельнай камісіі аб зацьверджаньні праэкту землеўпарадкаваньня абвяшчаецца зацікаўленаму насельніцтву праз сельскі савет. Калі пастанова зямельнай камісіі вымяняе паказаныя ў праэкце землеўпарадкаваньня межы новых землякарыстаньняў, то яна выконваецца землеўпарадчыкам, які робіць вымены ў натуры і напраўляе праэкт і плян.

Аб выкананьні праэкту землеўпарадкаваньня складаецца пратакол, які на працягу 7 дзён можа быць абскаржан зацікаўленымі старанамі ў зямельную камісію.

195. Райённая зямельная камісія знаходзіцца пры райённым выканаўчым камітэце і складаецца з старшыні і яго намесьніка, якія назначаюцца райённым выканаўчым камітэтам з членаў райённага выканаўчага камітэту і чатырох членаў: двух выбраных райённым зьездам саветаў, і землеўпарадчыка і агранома, назначаных зямельнымі аддзеламі акруговага выканаўчага камітэту і зацьверджаных райённым выканаўчым камітэтам. Для замяшчэньня адсутных членаў такім самым парадкам назначаюцца кандыдаты да іх.

196. Акруговая зямельная камісія знаходзіцца пры зямельным аддзеле акруговага выканаўчага камітэту і складаецца з старшыні, яго намесьніка і 6 членаў. У склад камісіі павінны ўваходзіць аграномы, мэліяратары і землеўпарадчыкі. Старшыня камісіі выбіраецца, а яго намесьнік і члены камісіі назначаюцца акруговым выканаўчым камітэтам.

197. У пасяджэньнях акруговай і райённай зямельнай камісіі павінны ўдзельнічаць старшыня альбо яго намесьнік і два члены альбо—у раённых зямельных камісіях—кандыдаты да іх. Адным з членаў альбо кандыдатаў, у залежнасьці ад характару справы, павінен быць аграном, мэліаратар ці землеўпарадчык.

199. Райённая зямельная камісія, як першая інстанцыя разглядае:

а) спрэчкі аб землях працоўнага карыстаньня, у паасобку аб захватах і арэндзе зямлі, аб пазбаўленьні права на працоўнае карыстаньне зямлёю і аб падзелах двароў;

б) іскі членаў двара аб маёмасьці двара, об утрыманьні, аб выплатах пры выхадзе са складу двара, аб зьмене гаспадара і аб няправільнай рэгістрацыі зьмен у складзе двара;

в) спрэчкі аб дзяржаўнай зямельнай маёмасьці райённага значэньня і аб скасаваньні дагавораў на гэтую маёмасьць;

г) іскі аб стратах, зьвязаных з землеўпарадчымі і зямельнымі справамі, якія разглядаюцца райённай зямельнай камісіяй;

д) скаргі на прыгавары сходаў зямельных грамад;

е) землеўпарадчыя праэкты па справах аб упарадкаваньні зямель працоўнага карыстаньня, дзяржаўнае зямельнае маёмасьці альбо аб зямежаваньні лясного фонду і скаргі на іх.

200. Акруговыя зямельныя камісіі, як першая інстанцыя, разглядаюць:

а) праэкты землеўпарадкаваньня па справах аб устаноўленьні і пашырэньні гарадзкой мяжы, аб адводзе зямель спэцыяльнага прызначэньня, аб устаноўленьні і зьменах межаў райёнаў і скаргі на іх;

б) спрэчкі аб дзяржаўнай зямельнай маёмасьці акруговага і рэспубліканскага значэньня і аб скасаваньні дагавораў на гэтую маёмасьць.

Акруговая зямельная камісія, як другая інстанцыя, канчаткова вырашае скаргі на рашэньні райённых зямельных камісій.

II. Дадаць да Зямельнага Кодэксу БССР артыкулы 167-1, 171-1 і 171-2 у наступнай рэдакцыі:

«167-1. Пакуль праэкт землеўпарадкаваньня не паказан васяльніцтву, усе скаргі і заявы аб землеўпарадкаваньні, калі-б яны ні былі пададзены, накіроўваюцца землеўпарадчыку. Землеўпарадчык разам з прадстаўніком сельскага савету ці раённага выканаўчага камітэту і грамадзкіх арганізацый абмяркоўвае ўсе заявы і скаргі, праэктуе іх вырашэньне і складае землеўпарадчы праэкт.

171-1. Удзельнікі землеўпарадкаваньня і ўсе зацікаўленыя ў ім асобы маюць права на працягу 2-х тыдняў пасьля паказу праэкту і абвяшчэньня пастановы зямельнай камісіі, якая разглядала землеўпарадчы праэкт, як першая інстанцыя, падаваць пісьмовыя скаргі ў вышэйшую судова-зямельную інстанцыю: на пастанову раённае зямельнае камісіі—у акруговую зямельную камісію, а на пастанову акруговае зямельнае камісіі—у Асобную Калегію Вышэйшага Кантролю па Зямельных Справах.

Неабскаржданы ва ўстаноўлены тэрмін праэкт землеўпарадкаваньня, паказаны насельніцтву ў адсутнасьці зямельнай камісіі (арт. 170), падаецца землеўпарадчыкам на яго зацьверджаньне.

171-2. Калі пры разглядзе раённаю зямельнаю камісіяй землеўпарадчага праэкту ня было спрэчак ці былі толькі незначныя спрэчкі, то раённая зямельная камісія зацьверджаўшы праэкт можа дазволіць выконваць яго раней сканчэньня тэрміну на абскаржаньне.

Акруговая зямельная камісія, калі ёй будзе пададзена скарга, можа адразу прыпыніць выкананьне такога праэкту і павінна разглядзець справу не пазьней месяца пасьля яе атрыманьня».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

17 мая, 1928 году.
г. Менск.

Постановление

Центр. Испол. Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

об изменении и дополнении Земельного Кодекса БССР.

Для приближения к населению, упрощения и ускорения землеустройства и рассмотрения земельных споров, согласно постановления VIII Всебелорусского С'езда Советов от 12 апреля 1927 года по докладу Народного Комиссариата Земледелия (С. З. БССР 1927 г., № 49, ст. 262), Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют:

1. Статьи 150, 161, 163, 164, 166, 173, 195, 197, 199 и 200 Земельного Кодекса БССР изложить в следующей редакции:

„150. Землеустроительные работы выполняются под общим наблюдением и контролем Народного Комиссариата Земледелия земельными органами через землемеров-землеустроителей или через сельские советы.

Категории землеустроительных работ, которые выполняются через сельские советы, и порядок их выполнения устанавливаются Народным Комиссариатом Земледелия.

161. Землеустройство производится в таком порядке:

1) возбуждение землеустроительного дела;

2) производство землеустроительных работ, составление проекта землеустройства и пред'явление его участникам землеустройства;

3) утверждение землеустроительного проекта и выполнение его.

163. Ходатайства о землеустройстве на землях трудового пользования должны проверяться представителями районного исполнительного комитета, который устанавливает:

а) законность ходатайства;

б) количество земли и дворов, которые должны быть землеустроены;

в) главнейшие основания проектируемого землеустройства и избираемую форму землепользования.

164. По рассмотрении материалов и проверке ходатайства о землеустройстве, районный исполнительный комитет включает дело в план работ или отказывает в его проведении, если найдет землеустройство нецелесообразным.

Жалобы на отказ районного исполнительного комитета в проведении землеустройства подаются в земельный отдел окружного исполнительного комитета не позднее двух недель со дня об'явления постановления.

166. Землеустроительными работами являются: установление границы подлежащей землеустройству земли, выяснение земельных прав участков землеустройства, хозяйственно-техническое обследование местности, где производится землеустройство, сравнительная расценка земель и отвод участков отдельным землепользователям (сельско-хозяйственным коммунам, артелям, поселкам и дворам) при внутрисельном землеустройстве с обеспечением интересов маломощных хозяйств, согласование пожеланий участков землеустройства без нарушения хозяйственно-технических правил землеустройства.

Примечание: В землеустройстве по приглашению землеустроителя участвуют агрономы, мелиораторы и другие специалисты.

В расценке земельных угодий и в распределении земли между участниками землеустройства для проведения классовой линии и защиты интересов бедноты обязательно участвует представитель районного исполнительного комитета.

167. Если при установлении границ земли, подлежащей землеустройству, есть существенные споры, то землеустроитель составляет проект разрешения этих споров и направляет его со всеми материалами в земельную комиссию для немедленного разрешения дела. Земельная комиссия, при вынесении решения, может разрешить немедленное исполнение его. В этом случае жалобы на решение земельной комиссии рассматриваются вместе с землеустроительным проектом.

168. По проведении землеустроительных работ, землеустроитель пишет проект землеустройства, в котором должно быть указано:

а) когда, где, на каком основании и какие именно землеустроительные работы выполнены;

б) краткое хозяйственно-экономическое обоснование проекта;

в) участники землеустройства;

г) кому, для какой надобности и где отводятся участки, размер этих участков и отдельных входящих в их состав угодий;

д) с какого времени и на каких условиях участники землеустройства должны пользоваться землей согласно проекта;

е) какие особые права и обязанности, связанные с полученными согласно проекта землями, предоставляются землепользователям и возлагаются на них;

ж) кому, от кого и какие именно возмещения следует за затраты на улучшение отведенной при землеустройстве земли;

з) другие важные сведения о землеустройстве данной территории.

169. Заинтересованное в землеустройстве население до исполнения проекта в установленном порядке должно пользоваться землей в границах, существовавших до начала землеустройства. Виновные в нарушении настоящей статьи отвечают, как за самоуправство.

170. Проект внутриселенного и межселенного землеустройства по проверке его землемером-ревизором пред'является землепользователям и одновременно рассматривается на месте производства работ земельной комиссией. Население должно быть оповещено о времени пред'явления проекта.

При пред'явлении проектов других видов землеустройства земельная комиссия может не присутствовать.

171. Земельная комиссия, рассмотрев землеустроительный проект и связанные с ним споры и жалобы, или утверждает проект без изменений, или производит изменения, если они не требуют пересоставления проекта, или поручает землеустроителю составить новый проект с указанием причин, вызывающих пересоставление.

172. С проектами хозяйственного устройства, составленными на основании утвержденных земельными комиссиями проектов группового землеустройства, землеустроитель ознакомляет каждое вновь образуемое сельско-хозяйственное об'единение в отсутствии в присутствии представителя сельского совета. Земельная комиссия таких проектов не утверждает.

173. Вступившее в законную силу постановление земельной комиссии об утверждении проекта землеустройства об'является заинтересованному населению через сельский совет. Если постановление земельной комиссии изменяет указанные в проекте землеустройства границы новых землепользований, то оно исполняется землеустроителем, который производит изменения в натуре и исправляет проект и план.

Об исполнении проекта землеустройства составляется протокол, который в течение 7 дней может быть обжалован заинтересованными сторонами в земельную комиссию.

195. Районная земельная комиссия находится при районном исполнительном комитете и состоит из председателя и его заместителя, назначаемых районным исполнительным комитетом, из членов районного исполнительного комитета, и четырех членов: двух, избранных районным с'ездом советов, и землеустроителя и агронома, назначенных земельным отделом окружного исполнительного комитета и утвержденных районным исполнительным комитетом.

Для замещения отсутствующих членов в том же порядке назначаются кандидаты ким.

196. Окружная земельная комиссия находится при земельном отделе окружного исполнительного комитета и состоит из председателя, его заместителя и 6 членов. В состав комиссии должны входить агрономы, медиораторы и землеустроители. Председатель комиссии избирается, а его заместитель и члены комиссии назначаются окружным исполнительным комитетом.

197. В заседаниях окружной и районной земельных комиссий должны участвовать председатель или его заместитель и два члена или—в раённых земельных комиссиях—кандидаты к ним. Одним из членов или кандидатов, в зависимости от характера дела, должен быть агроном, мелиоратор или землеустроитель.

199. Районная земельная комиссия в качестве первой инстанции рассматривает:

а) споры о землях трудового пользования, в частности о захватах и аренде земли, о лишении права на трудовое пользование землей и о разделах дворов;

б) иски членов двора об имуществе двора, о содержании, о выплатах при выходе из состава двора, о перемене домохозяина и о неправильной регистрации изменений в составе двора.

в) споры о государственном земельном имуществе районного значения и о расторжении договоров на это имущество;

г) иски об убытках, связанных с землеустроительными и земельными делами; которые рассматриваются районной земельной комиссией;

д) жалобы на приговоры сходов земельных обществ;

е) землеустроительные проекты по делам об устройстве земель трудового пользования, государственного земельного имущества или об отграничении лесного фонда и жалобы на их.

200. Окружные земельные комиссии в качестве первой инстанции рассматривают:

а) проекты землеустройства по делам об установлении и расширении городской черты об отводе земель специального назначения, об установлении и изменении границ районов и жалобы на них;

б) споры о государственном земельном имуществе окружного и республиканского значения и о расторжении договоров на это имущество.

Окружная земельная комиссия в качестве второй инстанции окончательно разрешает жалобы на решения районных земельных комиссий».

II. Дополнить Земельный Кодекс БССР статьями 167-1, 171-1 и 171-2 в следующей редакции:

«167-1. До пред'явления проекта землеустройства населению все жалобы и заявления о землеустройстве, кому бы они не подавались, направляются землеустроителю. Землеустроитель, вместе с представителем сельского совета или районного исполнительного комитета и общественных организаций, обсуждает все заявления и жалобы, проектирует их разрешение и составляет землеустроительный проект.

171-1. Участники землеустройства и все заинтересованные в нем лица имеют право в течение 2 недель по пред'явлении проекта и об'явлении постановления земельной комиссии, рассматривавшей землеустроительный проект в качестве первой инстанции, подавать письменные жалобы в высшую судебно-земельную инстанцию: на постановление районной земельной комиссии—в окружную земельную комиссию, а на постановление окружной земельной комиссии—в Особую Коллегию Высшего Контроля по Земельным Делам.

Необжалованный в установленный срок проек землеустройства, пред'явленный населению в отсутствие земельной комиссии (ст. 170) представляется землеустроителем на ее утверждение.

171-2. Если при рассмотрении районной земельной комиссией землеустроительного проекта не было споров или были только несущественные споры, то районная земельная комиссия, утвердив проект, может разрешить его исполнение до истечения срока обжалования.

Окружная земельная комиссия, при подаче ей жалобы, может немедленно приостановить исполнение такого проекта и должна рассмотреть дело не позже месяца по его получении".

Председатель ЦИК БССР А. Червяков.
Председатель СНК БССР Н. Голодед.
Секретарь ЦИК БССР А. Хацкевич.
г. Минск. 17 мая, 1928 г.

ХРОНІКА.

Новы склад рэдкалегій часопісяў.

Народны Камісарыят Асьветы зацьвердзіў рэдакцыйныя калегіі беларускіх часопісяў у наступным складзе: па часопісі «Полымя»—т. т. Баліцкі, Жылуновіч, Я. Купала, М. Чарот і Васілевіч; па часопісі «Узвышша»—т. т. Б. Чорны, Дуброўка, Крапіва, Шукевіч-Трацьцякоў і З. Бядуля; па часопісі «Маладняк»—т. т. Галавач, Лімановускі, Каваль, Моркаўка і Звонак.

Ці пагражае пахаладаньне садавіне.

Водлуг вестак, атрыманых у Наркамземе, апошняе пахаладаньне не пагражае пакуль што стану садавіны. Груша адцьвіла да дажджоў, яблыні, праўда, яшчэ не закончылі красаваньня, але і ім дажджы не маглі значна пашкодзіць.

Што-ж датычыцца іншых расьлін, то ад пахаладаньня можа толькі часова прыпыніцца рост іх.

Пашырэньне малочнай прамысловасьці.

Праўленьне Белсельбанку адпусьціла акругам 60.000 руб. доўгатэрміновага крэдыту, спэцыяльна на пашырэньне малочнай прамысловасьці. Усяго з пачатку 1927-28 гаспадарчага году на гэту справу адпушчана 260.000 руб.

Партыя замежных вэлёсыпэдаў для Аўтадору.

Цэнтральная Ўправа Аўтадору БССР атрымала першую партыю замежных вэлёсыпэдаў у колькасьці 210 штук.

Вэлёсыпэды разьмяркованы паміж аддзяленьнямі Аўтадору наступным чынам: Віцебскаму аддзяленьню—35 штук, Бабруйскаму—25 шт., Гомельскаму—30 шт., Полацкаму, Мазырскаму і Слуцкаму па 10 шт., Магілеўскаму і Аршанскаму—па 20 шт., Барысаўскаму і Клімавіцкаму—па 5 шт. і Менскай—50 штук.

Вэлёсыпэды будуць адпусканцца выключна сябром Аўтадору.

Другая партыя вэлёсыпэдаў мае быць атрымана з-за межаў у канцы чэрвеня.

Вывучэньне ільнаводзтва.

Наркамзем арганізуе праз Горацкую с.-г. дасьледчую станцыю вывучэньне сэлекцыйнага беларускага лёну Віцебскай і Полацкае округ. Апроч таго, будзе праводзіцца вывучэньне ільняных шкодніка ў і хвароб лёну ў сялянскіх гаспадарках Віцебскай, Полацкай і Аршанскай округаў.

Новыя кіно-фільмы.

Белдзяржкіно вядзе падрыхтоўку да здымкаў новых кіно-фільмаў. У першую чаргу будуць зроблены здымкі кіно-фільмаў: «Песьня вясны»—па апавяданьню народнага паэты Якуба Коласа „На прасторах жыцьця“ і «Атаман Муха» (прыключэнская кіно-фільма з Заходняй Беларусі).

Удзел спажыв. каапэрацыі БССР у Ніжагародзкім кірмашы.

Па прыкладу мінулых гадоў спажывецкая каапэрацыя БССР сёлета таксама прыме ўдзел у Ніжагародзкім кірмашы. На кірмашы каапэрацыя мэрнае закупіць жалеза-скабяныя і пасудна-гаспадарчыя тавары, футры, аўчыны, трыкатаж і саматужную тканіну, а таксама пэрсыдзкіх сухія фрукты. Усяго мяркуецца закупіць розных тавараў на суму да 1.500.000 р.

1-шы выпуск 3 яўрэйскай рабочай школы павышанага тыпу.

Адбыўся першы выпуск 3-й яўрэйскай рабочай школы павышанага тыпу. Выпушчана 13 чалавек.

Гэта першыя вынікі працы школы за тры гады. У пэрыяд рэканструкцыі народнае гаспадаркі, калі нам дорага кожная новая кваліфікаваная адзінка, мы павінны асабліва вітаць такіх людзей, якія, не адрываючыся ад сваёй вытворчасьці, адначасова ўзбройваліся ведамі, каб быць больш карыснымі для савецкай дзяржавы.

Менскі дзень.

Паштовыя скрынкі на аўтобусах, якія курсыруюць у Менску, устанаўляюцца Беларускай Управай Сувязі. Лісты з гэтых паштовых скрынак будуць вымацца служачымі Менскай чыгуначнай паштовай управы для адпраўкі іх з бліжэйшым пасадачным ці паштовым цягніком.

Разьмеркаваньне месц у польскіх вучэбных установах зрабіў Наркамасьветы. Згодна гэтага разьмеркаваньня, у Татарчынскую школу сялянскай моладзі, якая знаходзіцца ў Койданаўскім раёне, будзе прынята 40 чал., а ў Менскі польскі пэдтэхнікум—90 чал.

Агранамічнае, вэтэрынарнае і лябараторнае абсталяваньне прыбывае в Нясьвіжы для Нар. Кам. Земляробства БССР. Гэта абсталяваньне каштуе каля 6000 р.

Для п.-т. аддзяленьня ў Негарэлым мае быць пабудована вялікі будынак, на гэта адпушчана 82.000 руб.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК.

(НА 5-УІ 1928 г.).

Абл. 1 дзярж. паз.—прад. 4—56,5 куп. 4—54,5.

Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—06, куп. 5—04.

Абл. 2 сял. паз.—куп. 5.

Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—02, куп. 5—00.

Абл. 10 пр. паз. 27 г.—прад. 25—51 куп. 25—41.

Што слухаць па радыё.

Нядзеля, 3 чэрвеня.

11—00—11—30 Антырэлігійная гутарка «Адкуль пайшло сьвяткаваньне Тройцы і Духава дню».
11—30—11—45 Як выхоўваць дзяцей ад 3-х да 8-мі год.
11—45—01—00 Канцэрт.
07—00—07—30 Камсамольская радыёгазэта.
07—30—08—10 «Беларуская Вёска» па радыё.
08—10—08—40 Радыёаматар па радыё.
08—40—09—10 Політгляд міжнароднага становішча.
09—10—11—00 Мастацкая перадача.

Панядзелак, 4 чэрвеня.

07—00—07—30 Гутарка „Што новага ў барацьбе з бясьпрытульнасьцю“.
07—30—08—10 Беларуская радыёгазэта.
08—10—08—40 Бутарка „Аб равалюцыйнай законнасьці“.
08—40—09—10 Гутарка з рабселькорамі «Самакрытыка і рабселькоры».
09—10—11—00 Мастацкая перадача.

Апавяшчэньні.

Сёньня а 12 гадз. дня ў памяшканьні рэдакцыі газэты „Сав. Беларусь» адбудзецца агульны сход аб'яднаньня пісьменьнікаў „Полымя».

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— Сёньня, 3 чэрвеня, а 7 гадзіне ўвеч.—пасяджэньне праўленьня Дому.

Парадак дня: 1. Плян працы юн. сэкцыі, 2. Аб чарговых водпусках супрацоўнікаў Дому, 3. Бягучыя справы.

А 6 гадзіне ўвечары—пасяджэньне гаспадарчай кам. Дому.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

СУД.

ДЗЯЎЧЫНА-ЗЬВЕР.

Марыля Сапронава Дыдзік пасьля сьмерці маці засталася сіратой 9 год ад нараджэньня. Бацькі яна зусім ня помніць. Цяпер Марылі 20 год; яна крыху пісьменная. Апошнія тры гады Марыля Дыдзік вандравала па Менскай акрузе, служыла ў гор. Менску, але за свае «даўгія» рукі трымацца на месцы не магла. Каля году Марыля Дыдзік пражывала ў м. Смалявічах на кватэры ў грамадз. Бабінкай. Сродкі на жыцьцё Дыдзік зарабляла прастыцуцыяй і выпадковай падзённай працай.

Там-жа, у Смалявічах, побач з кватэрай Бабінкай у грамадз. Мяера Марыновіча жыла бяспрытульная бітрачка Алёна Войцік; умовы жыцьця яе былі вельмі цяжкія, тым больш, што яна была цяжарнай.

Пазнаёміўшыся з Марыляй, Алёна Войцік прасіла яе паразіць, дзе знайсьці службу, каб зарабіць кавалак хлеба. Марыля абяцала дапамагчы Алёне.

7 лютага г. г., пасьля нахмельня на загадзя абдуманаму плану, Марыля Дыдзік, схаваўшы ў хустку сякеру, прышла да Алёны Войцік і запрапанавала ёй пайсьці разам у вёску Плісы, дзе, па яе словах, магчыма паступіць на службу. Войцік згадзілася. Апрануўшы кажух, боцікі і галёшы, і яны накіраваліся ў вёску Плісу. Па дарозе, на полі, Алёна Войцік сагнулася падвязаць панчоху. У гэты час Марыля Дыдзік абухам сякеры моцна ўдарыла па галаве Алёну, ад чаго апошняя павалілася на зямлю, але яшчэ варушылася. Тады Дыдзік зарубала Алёну, садрала з яе кажух, боцікі і галёшы, і вярнулася назад у мястэчка.

Менскі акруговы суд прыгаварыў Марылю Сапронаву Дыдзік на дзевяць год выяволеньня з суровым адмежаваньнем.

Д. Кастроў.

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

Гідратэхнік забойца.

Адам Лагуцкі, гідратэхнік Менскага камгасу, 25 лютага г. г. п'яны, з васёлай кампаніяй, якая складалася з гр. Моўчана і 2 жанчын, вярнуўся на кватэру позна, калі гаспадыня дому Казлоўская ўжо лягла спаць. У накоі Лагуцкага госьці распачалі крык, песьні. Калі Казлоўская пачала прасіць Лягуцкага спыніць крык, ён расхвалява́ўся, уварваўся да Казлоўскай і застрэліў яе.

Суд прыгаварыў Адама Лагуцкага на чатыры гады зьняволеньня з суровым адмежаваньнем.

АБВЕСТКА.

МАГІЛЕЎСКІ ПЭДТЭХНІКУМ НА 14—16 ЧЭРВЕНЯ
СКЛІКАЕ КАНФЭРЭНЦЫЮ
ўсіх скончыўшых тэхнікум у 1925, 1926 і 1927 г.г.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА.
ВЫШАЎ З ДРУКУ
І ПРАДАЕЦЦА:
IV том поўнага збору твораў народнага паэты
ЯНКІ КУПАЛЫ.
ЗЬМЕСТ: Сон на кургане. Адвечная песьня. Песьня аб паходзе Ігара. Гальна.
ЦАНА 2 РУБ.

Да ведама падпісчыкаў „САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ“.
Пры неатрыманьні сваечасова газэты, трэба даведацца ў сваім паштовым аддзяленьні, ці ёсьць там КАРТКА на імя падпісчыка. Калі ёсьць, патрабаваць газэту там. Калі няма, зрабіць запытаньне ў кантору, паведаміўшы, куды здадзена падпіска, на які тэрмін, нумар квітка і свой дакладны адрас.
Без гэтых звестак скаргі разглядацца ня будуць.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА.
ВЫШЛІ З ДРУКУ І ПРАДАЮЦЦА
НОВЫЯ КНІГІ.

МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА.
А. Дудар. „Вежа“. Зборнік вершаў. Цана 65 к.
М. Нікановіч. «Крык працы». Збор апавяданьняў. Цана 35 к.
В. Сташэўскі. „Сьпявай вясна“. П'еса. Цана 20 к.
В. Сташэўскі. „Музыка Цьвілеўскі“. П'еса. Цана 25 к.

КРЫТЫКА.
«Янка Купала ў літаратурнай крытыцы». Збор крытычных артыкулаў.

ЗЬМЕСТ:
З. Жылуновіч.—Янка Купала пясьняр вызваленьня. М. Байкоў.—Месца Я. Купалы ў беларускай літаратуры. Ул. Дзяржынскі.—Янка Купала ў крытыцы. М. Піотуховіч.—Асноўныя этапы ў разьвіцьці лірыкі Я. Купалы. Ів. Замоцін.—Драматычныя творы Я. Купалы. А. Вазьнясенскі—Паэмы Я. Купалы. Ю. Дрэйзін—Музыка ў творах Я. Купалы. Л. Цвяткоў.—Я. Купала як перакладчык.

НАВУКОВА-ПОПУЛЯРНАЯ ЛІТАРАТУРА.
М. Рубакін. «Што такое падземны агонь». Цана 80 кап.
Лункевіч. «Грамадзкае жыцьцё жывёл. Цана 50 кап.
В. Румін. «Забаўная хомія». Цана 45 кап.

СЯЛЯНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА.
Уцехін. «Як захаваць вялёны корм на зіму». Цана 25 кап.
Тупяневіч. «Як здабываць корм у сялянскай гаспадарцы». Цана 23 кап.
Пранапенка. „Як палепшыць сенажаць“. Цана 25 кап.

ВАЙСКОВАЯ ЛІТАРАТУРА.
Хвасьцюк. „Ваенізацыя насельніцтва“. Цана 25 кап.
В. Бэрлін. «Як працаваць савету ленінскага кутка». Ц. 22 кап.
Н. Красноцольскі. Польскі салдат. Цана 40 кап.
Сычоў. Як чытаць кнігу і газэту. Цана 55 кап.

ПАЛІТЫЧНАЯ ЛІТАРАТУРА.
Я. Вольфсон. «За марксызм». Збор артыкулаў. Цана 2 руб.
„Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада“. Збор артыкулаў. Цана 25 к.

ПАДРУЧНІКІ.
Ів. Замоцін. „Мастацкая літаратура ў школьным выкладаньні» ч. II. Цана 90 кап.
Ів. Серада. «Ветэрынарыя і зоогігіена» ч. II. Цана 3 руб.
М. Байкоў і С. Некрашэвіч. «Расійска-беларускі слоўнік» (728 стар.). Цана 4 руб. 50 кап.

ДЗІЦЯЧЫЯ КНІЖКІ.
„Юныя гэрої“. Зборнік дзіцячых апавяданьняў з ілюстрацыямі. Ц. 25 к.
Амічыс. „Як дзяўчынка выратавала поезд“. Ц. 15 к.
Зімёнка. «Працавітая дзяўчынка». Ц. 22 к.
Яго-ж. „Пашы прыяцелі“. Ц. 60 к.
„ «Воўк-дурань». Народная казка. Ц. 55 к.
„ „Леў і воўк“ Народная казка. Ц. 50 к.
Я. Вір. «Маленькі балагол». Зборнік апавяданьняў. Ц. 25 к.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». 3 аўторка, 29 мая—грандыёзнае адчыненьне тэатру „МЮЗІК-ХОЛЛ“. У праграме—лепшыя расейскія і замежныя атракцыёны. Падрабязнасьці ў афішах.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“. Толькі 3 дні 1, 2 і 3 чэрвеня—замежны мастацкі фільм „ДАЧКА ДВУХ БАЦЬКОЎ“. Кіно-раман у 7 частках. Звыш праграмы—спатканьне М. Горкага ў Негарэлым і ў Менску.

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ». „СТЭНЛЕЙ У НЕТРАХ АФРЫКІ“. 2 серыі за адзін сэанс. На 1-шы сэанс—усе білеты па 25 кап. Пачатак раўна ў 6 гадз. 30 хв.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». З прычыны вялікага посьпеху яшчэ 3 дні—1, 2 і 3 чэрвеня—грандыёзная праграма: 1. „КНЯЖНА МЭРЫ“—у 8-х частках. 2. „БЭЛА“—у 7-х частках. Толькі 2 сэансы. Пачатак 1 сэансу а 7 гадз., 2—а 5.

С 1-го июня 1-я Минская артель чулочников ОБ'ЕДИНИЛАСЬ С АРТЕЛЬЮ ЧУ